WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

7 МАЯ 2010 г.
ПЯТНІЦА
№ 87
(26695)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«БЕЛАРУСЬ ЗАСТАЕЦЦА ФАКТАРАМ СТАБІЛЬНАСЦІ НА ЕЎРАПЕЙСКІМ КАНТЫНЕНЦЕ»

6 мая ў Нью-Ёрку быў зачытаны Зварот Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі на адрас удзельнікаў спецыяльнага ўрачыстага пасяджэння Генеральнай Асамблеі ААН, прысвечанага 65-годдзю Перамогі ў Другой сусветнай вайне.

У прыватнасці, у звароце гаворыцца:

«Нельга забываць, што асноўны ўдар фашысцкай агрэсіі быў накіраваны супраць Савецкага Саюза, народы якога асуджаліся на татальнае знішчэнне. Менавіта Савецкі Саюз адбіў гэты ўдар.

Мы па праве ганарымся тым, што Беларусь разам з іншымі народамі Савецкага Саюза ўнесла асноўны ўклад у Вялікую Перамогу над фашызмам.

У майго народа на генетычным узроўні заложаны код разумення таго, што пагрозу жыццю нясе любая канфрантацыя дзяржаў, паколькі яна здольная перарасці ў глабальную катастрофу.

Таму суверэнная еўрапейскай Беларусь настойліва і паслядоўна рэалізоўвае выключна міралюбівую палітыку!

Для прадухілення смертаносных канфліктаў трагічны вопыт Другой сусветнай вайны прывёў супольніцтва дзяржаў, сярод якіх была і Беларусь, да стварэння Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Але, на жаль, да гэтай пары не выкараненыя многія прычыны, якія правакуюць войны і таму патрабуюць сумесных і рашучых дзеянняў усіх дзяржаў. У гэтым трывожным пераліку — імкненне да сусветнага ўладарства, галеча, штучныя бар'еры ў гандлі, ксенафобія і фанатызм, ігнараванне права любога народа на свой шлях развіцця і навязванне ўсім адной мадэлі.

Беларусь заўсёды была і застаецца важным фактарам бяспекі і стабільнасці на еўрапейскім кантыненце і на сусветнай арэне. ААН мае ў нашай асобе надзейнага і актыўнага ўдзельніка барацьбы з незаконным распаўсюджваннем ядзернай зброі і ядзерных матэрыялаў, наркотыкаў, гандлем людзьмі, незаконнай міграцыяй і спробамі рэвізіі вынікаў Другой сусветнай вайны.

Мы, беларусы, і надалей будзем рабіць усё, што ад нас залежыць, па забеспячэнні супрацоўніцтва, міру і стабільнасці».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ НАПЯРЭДАДНІ ДНЯ ПЕРАМОГІ ЎРУЧЫЎ ДЗЯРЖУЗНАГАРОДЫ ВЯЛІКАЙ ГРУПЕ ВЕТЭРАНАЎ ВАЙНЫ

Акрамя таго, у ліку ўзнагароджаных былі ваеннаслужачыя і будаўнікі.

«Спадзяюся, што для вас сённяшняя сустрэча будзе ўдвая памятная, бо яна адбылася напярэдадні такой слаўнай гістарычнай даты, як Дзень Перамогі. Для нашага народа яна мае лёсавызначальнае значэнне, таму што з'яўляецца вялікім сімвалам перамогі жыцця над смерцю», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, мінаюць гады, дзесяцігоддзі, але 9 мая 1945 года не становіцца далёкім мінулым, не знікае з памяці людзей розных пакаленняў. І сёння яшчэ больш выразна ўсведамляецца велічгістарычнага подзвігу савецкага народа, які выратаваў ад фашысцкага прыгнёту не толькі сваю радзіму, але і ўсё чалавецтва. На жаль, з кожным годам менш і менш застаецца ўдзельнікаў тых легендарных падзей, і таму так важна акружыць увагай і клопатам кожнага прадстаўніка пакалення пераможцаў, якія са зброяй у руках абаранілі родную зямлю ад ворагаў. Прэзідэнт з асаблівым пачуццём удзячнасці і гордасці вітаў гэтых гераічных людзей: «Дарагія ветэраны, дзякуй вам за тое, што не далі паставіць наш народ на калені. Вы даказалі, што ніякі вораг не зможа нас ні зламаць, ні запалохаць, ні перамагчы, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Мы ніколі не забудзем, што менавіта вы, абпаленыя страшным агнём вайны, забяспечылі цяперашнюю эканамічную і духоўную базу развіцця Беларусі».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што аддаючы даніну памяці ўсім загінулым за Радзіму, асабліва ўсведамляеш простую ісціну: якое гэта вялікае шчасце — мір і спакой на роднай зямлі.

Ён падкрэсліў, што немагчыма перааценіць значэнне галоўнага складальніка дзяржавы — Узброеных Сілаў. «Высокі прафесіяналізм беларускіх ваеннаслужачых і гатоўнасць выконваць пастаўленыя задачы гарантуюць эфектыўнае процідзеянне замахам на незалежнасць і тэрытарыяльную цэласнасць нашай дзяржавы», — заявіў Прэзідэнт Беларусі, уручаючы ваеннаслужачым ордэны і медалі. Акрамя таго, шэраг кіруючых работнікаў сілавых структур атрымалі новыя пагоны.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што добрасумленная самаадданая праца — гэта галоўны рэсурс Беларусі. Дзякуючы прафесійнаму майстэрству і высокай грамадзянскай адказнасці рабочых, будаўнікоў, спецыялістаў народнай гаспадаркі паспяхова вырашаюцца самыя складаныя задачы ва ўсіх сферах жыцця грамадства. Напрыклад, наданне новага аблічча беларускай сталіцы, фарміраванне прывабнага іміджу для інвестараў, узвядзенне цудоўных збудаванняў для правядзення мерапрыемстваў міжнароднага значэння. Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, адзін з такіх прыярытэтных напрамкаў — падрыхтоўка Мінска да чэмпіянату свету па хакей 2014 года.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

207 ВАРЫЯНТАЎ МОДЫ БУДУЧЫНІ

У Мінску стартаваў XIX Міжнародны фестываль моды і фота

— Асаблівасць нашага конкурсу ў тым, што ў нас няма журы, — гаворыць **кіраўнік праекта «Млын моды» Саша ВАРЛАМАЎ.** — Таму што немагчыма параўнаць 207 калекцый, якія мы запланавалі паказаць за гэтыя два дні. Гэта тое самае, што параўноўваць Рубенса з Манэ, Мікеланджала з Рафаэлем (яны ўсе па-свойму прыгожыя). Але для таго, каб якімсьці чынам даць аднаку працы нашых дызайнераў, мы запрашаем міжнародных экспертаў. Геаграфія міжнародных экспертаў сёлета і сапраўды ўражвае: вядучыя спецыялісты са Швецыі, Германіі, Італіі, Брытаніі, Партугаліі, Чэхіі, Расіі, Бельгіі.

— Кожны год мы спадзяёмся пабачыць новыя стылі, якія прапаноўвае беларуская мода, — прызнаецца **эксперт з Вышэйшай школы мастацтваў Berlin- Weissensee Ірына ЛІДЫЯ-СЛАВАЦКІ.** — Перш за ўсё хочам паглядзець, як будзе рэалізаваны беларускі накірунак у нацыянальным касцюме. Хацелася б, каб дызайнеры працавалі з гэтым актыўней — стылізавалі беларускія арнаменты пад сучасны кантэкст штодзённасці.

«Стылізацыя нацыянальнага саслоўнага і прафесійнага касцюма» — адна з шэрагу калекцый, якія за два дні пакажуць гледачам. Дызайнеры і мадэлі будуць адзначаныя таксама ў намінацыях «Школа моды», «Майстар стылю», «Супермадэль Беларусі», «Фота», «Майстар моды», «Міс і Містэр мадэль Беларусі», «Мадэль-лідар сярод прафесіяналаў фестывалю». Асаблівая «разынка» — спецыяльны праект Цэнтра моладзевай моды БДУ пад назвай «Сапраўднае дэфіле» з удзелам 35 вядомых персон тэатра, тэлебачання і спорту, якія выступяць у ролі мадэляў. Афіцыйнае закрыццё «Млына моды» запланавана на 8 мая. Уся праграма фестывалю транслюецца на тэлевізійны экран, усталяваны ля Палаца спорту.

Ілья ЛАПАТО.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СВОЙСКІ ЖУРАВЕЛЬ

Аздобленая крыніца-студня ў вёсцы Сіманічы Лельчыцкага раёна. Ваду чэрпае маладая маці Людміла Цішкевіч.

УЛАДАЛЬНІКІ ПУСТУЮЧЫХ КВАТЭР З 1 ЧЭРВЕНЯ БУДУЦЬ ПОЎНАСЦЮ АПЛАЧВАЦЬ ЗАТРАТЫ НА ТЭХАБСЛУГОЎВАННЕ І АЦЯПЛЕННЕ

Такое рашэнне змешчана ў пастанове ўрада Беларусі № 639, паведамілі БЕЛТА ў Апараце Саўміна.

У дакументе сказана, што пры наяўнасці ў грамадзяніна ва ўласнасці і (або) карыстанні аднаго або некалькіх жылых памяшканняў і адсутнасці ў іх (у адным з іх) зарэгістраваных па месцы жыхарства наймальніка, уласніка, члена арганізацыі забудоўшчыкаў і (або) членаў іх сем'яў плата за тэхнічнае абслугоўванне і цэнтральнае ацяпленне гэтых памяшканняў ажыццяўляецца па ўстаноўленых беларускім заканадаўствам тарыфах на паслугі па тэхнічным абслугоўванні жылых дамоў і на цеплавую энергію для патрэбаў ацяплення і гарачага водазабеспячэння, якія забяспечваюць поўнае пакрыццё эканамічна абгрунтаваных затрат на аказанне такіх паслуг.

У выпадку наяўнасці ў юрыдычнай асобы ва ўласнасці, бязвыплатным карыстанні, гаспадарчым распараджэнні або аператыўным кіраванні жылога памяшкання і адсутнасці дагавора найму гэтага жылога памяшкання плата за тэхнічнае абслугоўванне і цэнтральнае ацяпленне ажыццяўляецца ў такім жа парадку.

Плата за камунальныя паслугі з грамадзян, якія пражываюць у сядзібных жылых дамах павышанай камфортнасці, спаганяецца па ўстаноўленых заканадаўствам тарыфах, што забяспечваюць поўнае пакрыццё эканамічна абгрунтаваных затрат на аказанне гэтых паслуг, на падставе пералікаў такіх дамоў, зацверджаных гарадскімі, раённымі выканаўчымі камітэтамі, адміністрацыямі раёнаў у гарадах. Да сядзібных жылых дамоў павышанай камфортнасці адносяцца сядзібныя жылыя дамы (кватэры ў блакіраваных жылых дамах) з агульнай плошчай жылых памяшканняў больш за 200 кв.м, маючыя гаспадарча-пітное і гарачае водазабеспячэнне, каналізацыю, ацяпленне і вентыляцыю, электрасвятленне ад цэнтралізаваных, мясцовых або індывідуальных сістэм з выкарыстаннем традыцыйных або альтэрнатыўных крыніц, абсталяваныя газавымі або электрычнымі плітамі, размешчаныя ў г. Мінску і яго прыгараднай зоне, абласных гарадах і прылеглых да іх адміністрацыйных раёнах, райцэнтрах.

Арганізацыі, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю жыллёвага фонду і (або) аказваюць камунальныя паслугі, арганізацыі, што праводзяць налічэнне платы за жыллёва-камунальныя паслугі, да 15 чысла месяца, які ідзе за скончаным, абавязаны накіроўваць наймальнікам, уласнікам жылых памяшканняў, членам арганізацыі забудоўшчыкаў паведамленні аб памеры платы за жыллёва-камунальныя паслугі па форме, устаноўленай Мінжылкамгасам. Налічэнне і спагнанне пені за пратэрміноўку ўнясення грамадзянамі платы за жыллёва-камунальныя паслугі праводзяцца арганізацыямі, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю жыллёвага фонду і (або) аказваюць камунальныя паслугі, або арганізацыямі, якія налічваюць плату за жыллёва-камунальныя паслугі.

З УСІМІ ПЫТАННЯМІ — ДА ЛЮДЗЕЙ У СІНІХ КАМІЗЭЛЬКАХ

— Без агляду на масавыя святочныя мерапрыемствы ніхто не пройдзе, — папрасіў давесці да тых, хто не плануе 9 мая прасядзець дома, першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення аховы, правапарадку і прафілактыкі МУС Беларусі Аляксандр БАРСУКОЎ. — Хто б гэта ні быў: супрацоўнік праваахоўных органаў, журналіст ці нехта іншы... І да гэтага трэба ставіцца з разуменнем. Кантрольна-прапускныя пункты будуць арганізаваныя ў месцах найбольш значных святочных мерапрыемстваў выключна ў мэтах бяспекі.

У выпадку вялікіх чэргаў супрацоўнікі міліцыі агледзяць людзей пры дапамозе ручных металадэтэктараў. Менавіта таму, каб паспець прайсці агляд, прыходзіць на парад, канцэрт альбо салют супрацоўнікі міліцыі рэкамендуюць за паўтары-дзве гадзіны да пачатку мерапрыемстваў. Бо, як паказвае практыка мінулых гадоў, на 9 мая толькі ў раёне стэлы «Мінск — горад-герой» збіраецца каля 400 тысяч мінчан і гасцей горада.

Паводле слоў Аляксандра Пятровіча, на святочныя мерапрыемствы не будуць прапускаць з грувасткімі рэчамі — сумкамі, заплечнікамі, чамаданамі, колючымі і рэжучымі прадметамі, з агнястрэльнай зброяй і шкляной тарай (дазваляецца, але не рэкамендуецца, мець пры сабе прахаладжальныя напіткі ў празрыстых пластыкавых бутэльках аб'ёмам не больш за 0,5 л) .

— Ваду і прахаладжальныя напіткі можна будзе набыць непасрэдна ў месцах правядзення святочных мерапрыемстваў, — падкрэсліў Аляксандр Барсукоў. — Ветэранам жа будуць раздаваць ваду ў пластыкавай тары бясплатна.

Не пройдуць на свята і людзі, якія ледзь трымаюцца на нагах. Улічваючы святочны настрой мінчан і гасцей сталіцы, супрацоўнікі міліцыі пастараюцца пераканаць грамадзян, якія знаходзяцца на падпітку, самім дабрацца дадому. Да ветэранаў жа ў міліцыянераў будуць больш лаяльныя адносіны.

— Калі спатрэбіцца, то і дадому правядзём, — пераканаў Аляксандр Барсукоў. — Але масава ўсіх нецвярозых міліцыя развозіць па дамах не будзе.

СТАР. 2

МІЛЫЯ СПРАЧАЮЦЦА...

У бальніцу г. Іванава быў дастаўлены жыхар в. Мохра з паламанымі рэбрамі. Мужчыну пасля застолля сякерай пакалечыла сужыцелка. І сам пацярпелы раней быў асуджаны за тое ж...

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

УРАД ЭСТОНІІ АДМОВІЎСЯ ПАВЯЛІЧЫЦЬ «УЗРОСТ ЗГОДЫ»

Урад Эстоніі не падтрымаў ініцыятыву пра павышэнне ў краіне «ўзросту згоды» — узросту, пры якім дазволена ўступаць у сэксуальныя адносіны.

У наш час эстонскае заканадаўства дазваляе сэксуальныя адносіны, пачынаючы з 14 гадоў. З прапановай падняць планку да 16 гадоў выступіла Партыя зялёных, яе падтрымалі Саюз абароны дзяцей і эстонскае аддзяленне UNICEF. Паводле меркавання кіраўніка Саюза Алара Тамма, гэта павялічыла б абарону падлеткаў ад злачынстваў сэксуальнага характару.

КІРАЎНІК МАГАТЭ ПРАПАНАВАЎ ПРЫМУСІЦЬ ІЗРАІЛЬ ПАДПІСАЦЬ ЯДЗЕРНУЮ ДАМОВУ

Кіраўнік Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі Юкіа Амана накіраваў краінам-падпісантам Дамовы пра нераспаўсюджанне ядзернай зброі ліст з прапановай распрацаваць рэзалюцыю, якая заклікае Ізраіль падпісаць гэтую дамову. Пра гэта 6 мая паведамляе АР.

Як адзначае агенцтва, краіны «ядзернага клуба» — ЗША, Расія, Вялікабрытанія, Францыя і Кітай ужо падтрымалі ініцыятыву пра абвяшчэнне блізкаўсходняга рэгіёна бяз'ядзернай зонай, раней прапанаваную Лігай арабскіх дзяржаў. У адпаведнасці з прапановай кіраўніка МАГАТЭ, у распрацоўцы рэзалюцыі, якая заклікае Ізраіль падпісаць дамову, павінны прыняць удзел усе краіны-падпісанты гэтай дамовы. На сённяшні дзень дакумент падпісала 151 краіна.

БОЛЬШ ЗА МІЛЬЁН НЕМЦАЎ НЕ МОЖА ПРАЖЫЦЬ НА СВАЮ ЗАРПЛАТУ

Колькасць грамадзян Германіі, якія, нягледзячы на поўную ці частковую занятасць, звярнуліся за сацыяльнай дапамогай Hartz IV, узрасло ў 2009 годзе да 1,3 мільёна чалавек. Як паведамляе Spiegel са спасылкай на Федэральную службу занятасці, яны змушаны ісці на такі крок з-за таго, што зарплаты ім не хапае на жыццё.

Паводле інфармацыі адмыслоўцаў, у апошнія гады гэтая тэндэнцыя толькі ўзмацняецца. Так, у чэрвені 2005 года, адразу пасля пачатай урадам сацыял-дэмакратаў і зялёных рэформы рынка працы, доля працуючых грамадзян, якія звяртаюцца за сацыяльнымі выплатамі, складала 1,5 працэнта ад агульнай колькасці атрымальнікаў дапамог. У 2009 годзе гэты паказчык дасягнуў адзнакі 2,6 працэнта.

САМЫ ЛЮБІМЫ ФІЛЬМ ПРА ВАЙНУ

Народны рэйтынг лепшых кінастужак пра народную вайну апублікаваны ў Расіі напярэдадні 65-годдзя Перамогі. Абыякавыя да ваенных фільмаў толькі 5% расіян — такія вынікі апытання, праведзенага даследчым цэнтрам партала Superjob.

Самым любімым прызнаны фільм Леаніда Быкава «У бой ідуць адны старыя» (22 %). На другім месцы апынуўся фільм Станіслава Растоцкага «А світанкі тут ціхія» — кранальная гісторыя пра пяць дзяўчын, накіраваных на тэрміновую службу ў прыфрантавую паласу, і іх старшыну (16 %). На трэцяе месца выйшаў серыял «Сямнаццаць імгненняў вясны» (7 %), новае жыццё да якога прыйшло пасля яго «расфарбоўвання», што выклікала нямала спрэчак. Фільм 1971 года «Афіцэры» і аднайменны серыял, зняты ў 2006 годзе Мурадам Аліевым, заняў чацвёртае месца ў спісе (6 %). Стужка Сяргея Бандарчука па аднайменным рамане Міхася Шолохова «Яны ваявалі за Радзіму» (1975 год) апынулася на пятым месцы (5 %).

З фільмаў, якія з'явіліся ў апошняе дзесяцігоддзе, самую вялікую папулярнасць завяваявала кінастужка Міхаіла Пташука «У жніўні 44-га», знятая па рамане Уладзіміра Багамолава «Момант ісціны», якая выйшла на экраны ў 2001 годзе. У яе шостае месца (3 %).

Прамая лінія

АБ СПРАВАХ САРДЭЧНЫХ

мы пагаворым на нашай чарговай «прамой лініі», у якой возьмуць удзел **загадчык інфарктнага аддзялення № 2 10-й мінскай гарадской клінічнай бальніцы Наталля Якаўлеўна ПАЛЯЎКОВА** і **ўрач-кардыёлаг таго ж аддзялення Ірына Віктараўна ГРЫШЫНА.** У нашых гасцей вы зможаце запытаць пра хваробы, звязаныя з артэрыяльным ціскам, пра тое, як папярэдзіць інфаркты і інсульты, пра лячэнне гэтых паталогій і рэабілітацыю пасля іх.

«Прамая лінія» адбудзецца 11 мая, у аўторак, з 16.00 да 17.30 па нумарах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах 8 (017) 287 18 29 і 287 18 36.

УЛАДЗІМІР ПАНЦЮХОЎ УЗНАЧАЛІЎ МАГІЛЁЎСКІ АБЛАСНЫ САВЕТ ДЭПУТАТАЎ

6 мая на першай арганізацыйнай сесіі дэпутаты Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў новага 26-га склікання выбралі свайго лідара. Ім стаў Уладзімір Панцюхоў, які ўзначальваў абласны Савет папярэдняга склікання.

Сваю задачу, як і ўсіх новаабраных дэпутатаў, ён бачыць у цеснай працы з насельніцтвам. Найбліжэйшым часам абласны Савет у новым складзе мае намер заняцца праблемай падтрымкі асабістых падсобных гаспадарак і добраўпарадкаваннем, навядзеннем парадку на зямлі. У Год якасці Уладзімір Панцюхоў ініцыюе новую праграму: «Будаўніцтву жылля — дэпутацкі клопат».

Ілона ІВАНОВА.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ТРЫ ЧАЛАВЕКІ ЗАГІНУЛІ Ў АВАРЫІ

4 мая паблізу вёскі Цішоўка Магілёўскага раёна адбылося сутыкненне грузавога фургона «Форд-Транзіт» і аўтамабіля «Опель-Аскона».

Фота Магілёўскай ДАІ.

— Магіляўчанін 27 гадоў, які кіраваў грузавіком, на скрыжаванні пры выездзе на галоўную дарогу з другараднай не саступіў дарогу і сутыкнуўся з легкавым аўтамабілем, які атрымаў значныя пашкоджанні і з'ехаў у кювет, — паведаміў старшы інспектар аддзялення прапаганды і агітацыі Магілёўскай ДАІ Андрэй Калеснік.

У «Опелі» ехалі 5 пасажыраў: 3 з іх загінулі на месцы, мужчына і 3-гадовае дзіця дастаўленыя ў бальніцу. Абодва вадзіцелі не пацярпелі.

Ілона ІВАНОВА.

8,5 КГ РТУЦІ

знойдзена на трансфарматарнай падстанцыі па вуліцы Фядзюнінскага ў Гомелі, — паведамілі ў цэнтры прапаганды і навучання Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС.

Супрацоўнікі энерганагляду пры правядзенні рамонтных работ знайшлі скрыню з трыма гумавымі ёмістасцямі, у якіх захоўвалася ядавітае рэчыва. Выратавальнікі, якія прыбылі на месца знаходкі, правялі дэмеркурызацыю, бо 10 грамаў рэчыва вылілася наружу.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

У РУХУ ТРАНСПАРТУ — ЗМЯНЕННІ

7 і 8 мая з 13.30 да 19.30 на праспекце Машэрава ў Мінску (ад вуліцы Даўмана да праспекта Пераможцаў) у сувязі з правядзеннем генеральных трэніровак удзельнікамі параду рух аўтобусаў №№29, 44, 136 будзе арганізаваны па вуліцы Багдановіча — праспекце Пераможцаў у абодвух накірунках з выкананнем усіх прыпыначных пунктаў, паведамілі ў дзяржаўным прадпрыемстве «Мінскстранс». Паводле інфармацыі Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі, 12, 19, 26 мая на ўчастку Мінск — Орша скразнога руху не будзе.

Сяргей РАСОЛЬКА.

У БОЛЬШАСЦІ РЫНКАЎ — ВЫХАДНЫ

10 мая, у панядзелак, амаль усе сталічныя рынкі працаваць не будуць.

Выключэнне, як паведамілі рэдакцыі ў аддзеле арганізацыі гандлю галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама, будзе датычыцца толькі «Ракаўскага кірмашу», «Велазаводскага» і «Уральскага». Гэтыя тры рынкі ў панядзелак будуць працаваць у звычайным рэжыме. 15 мая, дадалі спецыялісты, будзе для ўсіх мінскіх рынкаў працоўным днём.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 07.05.2010 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▲ 1 долар ЗША	2 981,00	1 чэшская крона	146,56	USD	30,2971
▼ 1 еўра	3 810,61	1 польскі злоты	931,68	10 UAH	38,0617
1 латвійскі лат	5 390,11	▼ 1 расійскі рубель	98,39	1000 BYR	10,1771
1 літоўскі літ	1 104,22	1 украінская грыўня	374,50	EUR	38,6833

Агенцтва Уладзіміра Грачова

КАНТРАБАНДНАЯ ЦЯЛЯЦІНА

У Кобрынскім раёне быў затрыманы аўтамабіль пад кіраваннем жыхара Ратнаўскага раёна Украіны.

Без усялякіх дакументаў грамадзянін суседняй краіны спрабаваў перавезці праз мяжу аж 24 тушы цялят. Тавар ацэнены на суму больш за 17 мільёнаў рублёў.

Яна СВЕТАВА.

Прэзідэнт Беларусі ў другой палове 2010 года плануе наведаць Іран

6 мая Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з міністрам прамысловасці і шахтаў Ірана Алі Акбарам Мехраб'янам.

«Думаю, што гэта добрая сустрэча напярэдадні нашай сустрэчы з прэзідэнтам Ірана ў другой палове гэтага года ў Тэгеране», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама падкрэсліў, што Беларусь у перспектыве разлічвае на рэалізацыю больш маштабных праектаў з Іранам.

Міністр прамысловасці і шахтаў Ірана прызнаў, што ў супрацоўніцтве па асобных напрамках сапраўды ёсць некаторыя праблемы, якія ўплываюць на тэрміны дасягнення пастаўленых мэтаў. Ён паведаміў, што Прэзідэнт Ірана прыняў рашэнні, у выніку якіх ход рэалізацыі праектаў будзе паскораны.

Цяпер у Беларусі зарэгістравана 6 сумесных беларуска-іранскіх прадпрыемстваў, 18 прадпрыемстваў са стопрацэнтным іранскім капіталам, а таксама два банкі з іранскім капіталам. Тавараабарот Беларусі і Ірана па выніках 2009 года склаў $71,6 млн, у тым ліку беларускі экспарт — $63,2 млн, імпарт — $8,4 млн. У першым квартале гэтага года ў параўнанні з аналагічным перыядам 2009 года тавараабарот павялічыўся ў 2,5 раза, пры гэтым беларускі экспарт узрос у 4,3 раза. Асноўнымі артыкуламі беларускага экспарту ў Іран з'яўляюцца сінтэтычныя валокны і жгут сінтэтычных ніцей, металапрадукцыя, грузавыя аўтамабілі, трактары, калійныя ўгнаенні. Наша краіна ў асноўным імпартуе легкавыя аўтамабілі і часткі да іх, фрукты.

У кастрычніку 2007 года паміж Нацыянальнай іранскай нафтавай кампаніяй і кампаніямі РУП «ВА «Беларуснафта» і «Петраіран Дэвэлапмент Компані» быў падпісаны кантракт на распрацоўку радовішча Джуфейр у Іране. Чакаецца, што ранняя стадыя здабычы нафты можа быць пачата ў другім паўгоддзі 2010 года. Дадатковым перспектыўным напрамкам супрацоўніцтва ў нафтавай сферы можа стаць арганізацыя паставак нафты на беларускія НПЗ для яе перапрацоўкі. Магчымы таксама ўдзел прыватных іранскіх кампаній у рэалізацыі праектаў на тэрыторыі Беларусі ў галіне капітальнага будаўніцтва і мадэрнізацыі інфраструктуры.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў галоўнага рэдактара часопіса «Вясёлка» Уладзіміра Ліпскага з 70-годдзем

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў галоўнага рэдактара часопіса «Вясёлка» лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Ліпскага з 70-годдзем.

«Вас паважаюць за актыўную грамадзянскую пазіцыю і шматгадовую работу на пасадзе старшыні Праўлення Беларускага дзіцячага фонду, дзякуючы якой змяніліся да лепшага лёсы многіх маленькіх грамадзян нашай краіны, — адзначаецца ў віншаванні. — Напісаныя Вамі кнігі падабаюцца юным і дарослым чытачам, таму што яны прасякнуты любоўю да роднай зямлі і яе народа, непарыўна звязаны з гераічнай гісторыяй Беларусі, вучаць шанаваць Радзіму, быць добрымі і справядлівымі». Аляксандр Лукашэнка пажадаў юбіляру невычэрпнага натхнення, творчых поспехаў, здароўя, бадзёрасці і аптымізму.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

АКЦЫЯ ГАНДЛЮ Ў ГОНАР ВЕТЭРАНАЎ ПАШЫРАЕЦЦА

Да акцыі, што праводзіцца арганізацыямі гандлю і бытавога абслугоўвання насельніцтва для ветэранаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і прыраўнаваных да іх асобаў (бясплатныя паслугі, продаж тавараў са зніжкамі), далучаюцца ўсё новыя прадпрыемствы і індывідуальныя прадпрымальнікі. Паводле размешчанай на сайце Міністэрства гандлю аператыўнай інфармацыі, іх колькасць па ўсёй краіне ўжо перавысіла лічбу 140.

Напрыклад, да гэтай высакароднай акцыі ў сталіцы далучылася УП «Гарадскія лазні»: на працягу ўсяго мая яно абяцае пералічаным вышэй асобам бясплатнае абслугоўванне ў агульных аддзяленнях лазневых падраздзяленняў і цырульнях. УП «Аўрум» па 10 мая адрамантуе ахвотным ювелірныя вырабы са зніжкай у 50 працэнтаў і вырабіць новыя са зніжкай у 10 працэнтаў. УП «Белхімчыстка» па 9 мая дае 50-працэнтную зніжку на чыстку паліто-касцюмнага асартыменту (у колькасці трох адзінак), а таксама памые бялізну з 30-працэнтным зніжэннем цаны за паслугу.

УП «БытЭкс» па 10 мая будзе весці бясплатнае абслугоўванне ў пральнях самаабслугоўваня. УП «Белізна» і УП «Чайка» да той жа даты даюць кліентам з ліку вышэйназваных зніжку на мыццё бялізны — адпаведна на 40 і 10 працэнтаў. ЗАТ «Яліна» па 10 мая пры тэрміновым рамонце абутку возьме за паслугу на 20 працэнтаў менш. ЗАТ «Вілія» па 3 ліпеня праводзіць акцыю, асноўная ідэя якой заключаецца ў бясплатнай фотасесіі для ветэранаў і вырабе для іх мастацкіх фотапартрэтаў (фотаздымкі памерам 20х30 сантыметраў). Лепшыя з іх будуць выстаўленыя на выставах, што пройдуць у найбольш людных месцах.

На Гомельшчыне да акцыі далучылася ААТ «Кармянскае КБА»: да канца мая зніжку ў памеры 50 працэнтаў атрымаюць ветэраны, удзельнікі вайны і прыраўнаваныя да іх асобы на цырульніцкія паслугі, на паслугі па рамонце і пашыве адзення, а таксама пры выязным абслугоўванні. А мясцовае ж раённае спажывецкае таварыства 8 і 9 мая будзе прадаваць харчовыя тавары на 10 працэнтаў танней. Напрыклад, у Мазыры шэраг крамаў даюць на розныя тэрміны 5-працэнтную зніжку на харчовыя і нехарчовыя тавары. У Калінкавічах ТАА Медасвет» пры наведванні па 9 мая гандлёвага кірмашу ўручае ветэрану ў падарунак слоічак (0,5 кілаграма) мёду, а ААТ «Райбытпаслугі» па 20 мая дае зніжку 30 працэнтаў на ўвесь спектр бытавых паслуг.

Нагадваем яшчэ раз, што больш падрабязную інфармацыю адносна правядзення акцыі у канкрэтным горадзе (тэрміны, пералік паслуг і тавараў, памеры зніжак, месцы правядзення, адрасы і тэлефоны арганізацый гандлю і бытавога абслугоўвання насельніцтва) можна атрымаць на сайце Міністэрства гандлю (mintorg.by).

Сяргей РАСОЛЬКА.

Тарыфы на электрычнасць будуць мяняцца?

У Беларусі разглядаецца магчымасць памяншэння перакрыжаванага субсідзіравання пры рэалізацыі электраэнергіі, што адбываецца ў выніку больш нізкіх тарыфаў на электрычнасць для насельніцтва ў параўнанні з тарыфамі для прадпрыемстваў. Пра гэта сказаў на сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі намеснік міністра эканомікі краіны Анатоль Філонаў. Ён падкрэсліў, што рыхтуецца прапанова па зніжэнні перакрыжаванага субсідзіравання. Як сказаў А. Філонаў, у нас тарыфы для насельніцтва ў 2 разы ніжэйшыя, чым у Еўропе, і ў 2 разы вышэйшыя для рэальнага сектара эканомікі, чым у Расіі.

МЕТАЛАШУКАЛЬНІК

7 электрарухавікоў выцягнуў з тэрыторыі зернесушыльнага комплексу СВК «Урыцкае» непрацуючы жыхар вёскі Целяшы Гомельскага раёна. Ён разукамплектаваў сушыльную шахту «КЗС-40». Страты, якія грамадзянін нанёс прадпрыемству, складаюць больш за 6 мільёнаў рублёў. Аднак частку выкрадзенага ў яго паспелі канфіскаваць.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

«ЗАЛАТЫЯ ЛІТАРЫ» ЎРУЧЫЛІ Ў ШОСТЫ РАЗ

Журналістка «Звязды» Наталля Карпенка стала лаўрэатам традыцыйнага конкурсу друкаваных СМІ ў намінацыі «Лепшы аглядальнік»

У гэтым годзе конкурс «Залатая Літара» набыў новы фармат. Творчае спаборніцтва праводзілася па 22 намінацыях.

Беларускае тэлеграфнае агенцтва стала лаўрэатам конкурсу ў намінацыі «Лепшыя матэрыялы грамадска-палітычнай тэматыкі». Галоўнай узнагароды ў гэтай намінацыі ўдастоена газета «Советская Белоруссия».

БЕЛТА таксама стала лаўрэатам у намінацыі «Лепшыя іміджавыя матэрыялы пра Беларусь». Дыпломам «Залатой Літары» адзначаны матэрыялы партала Belarus.by, распрацоўкай і прасоўваннем якога займаецца Беларускае тэлеграфнае агенцтва. А «Залатую Літару» ў гэтай намінацыі прафесійнае журы прысудзіла шэрагу выданняў Установы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия» для распаўсюджвання за мяжой.

Гран-пры «Лепшы творчы праект года рэспубліканскіх друкаваных СМІ, інфармацыйных агенцтваў» VI Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая Літара» ўдастоены праекты адразу двух выданняў — газеты «Культура» і «Народной газеты». Газета «Культура» перамагла з праектам «Дыміліся франтоў дарогі». «Народная газета» ўдастоена Гран-пры за часопіс «Родная прырода» і праект «Сем цудаў», перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Рэдактар аддзела Беларускага тэлеграфнага агенцтва Алена Прус атрымала дыплом як аўтар лепшых матэрыялаў сацыяльнай тэматыкі. «Залатая Літара» за матэрыялы сацыяльнай тэматыкі ўручана газеце «Аргументы и факты в Беларуссии».

Лепшыя матэрыялы па тэматыцы спорту і здарова ладу жыцця, паводле меркавання журы, прадставіла газета «Белорусская нива», навуковай і навукова-папулярнай тэматыкі — часопіс «Планета». Гэтыя выданні атрымалі галоўную ўзнагароду конкурсу, а ўладальніцай «Залатой Літары» за лепшыя матэрыялы культурнай і гісторыка-краязнаўчай тэматыкі стала Рэгіна Гамзовіч (часопіс «Алеся»). Газета «Наш час» (Ваўкавыск) атрымала ўзнагароду за лепшыя матэрыялы грамадска-палітычнай тэматыкі, газета «Віцебскі рабочы» — за лепшыя матэрыялы сацыяльна-эканамічнай тэматыкі...

У персанальных намінацыях першынство сярод фотакарэспандэнтаў дасталося Наталлі Аблажэй — фотакарэспандэнту БЕЛТА. Лепшым рэпарцёрам стаў спецыяльны карэспандэнт «Советской Белоруссии» Мікалай Казловіч, а лепшым аглядальнікам — рэдактар газеты «Рэспубліка» Уладзімір Валчкоў. **У гэтай жа намінацыі лаўрэатам стала рэдактар аддзела мясцовага самакіравання «Звязды» Наталля Карпенка.**

Лепшым афарміцелем-дызайнерам названы намеснік начальніка аддзела агенцтва «Ваяр» Вячаслаў Белакапытаў. «Юридическая газета» заваявала пальму першынства ў спецыяльнай намінацыі «Дэбют», а вядучая цырымоніі конкурсу «Залатая Літара» Вера Палякова — у спецыяльнай намінацыі «Партнёрства».

Новай намінацыяй конкурсу стала спецыяльная намінацыя «За ўклад у развіццё журналістыкі». Першую «Залатую Літару» ў гэтай намінацыі журы прысудзіла галоўнаму рэдактару «Советской Белоруссии» Паўлу Якубовічу.

БЕЛТА.

Парламенцкі дзённік

НЯМА ЛІТАСЦІ КАРУПЦЫЯНЕРАМ

Тым, хто «сядзіць» за хабар, якім бы мізэрным ён ні быў, амністыя не свеціць

Як і прыцягнутым да крымінальнай адказнасці за нецвярозае кіраванне аўто. Трапіўшы ў адну кампанію з асабліва небяспечнымі рэцыдывістамі, асуджанымі на пажыццёвае заключэнне, забойцамі, гвалтаўнікамі і г.д., усе без выключэння карупцыянеры (незалежна ад маштабаў злоўжывання) апынуліся за бортам дзяржаўнага акта гуманізму. У гэтым — адрозненне сёлетняй амністыі (ужо другі год запар шанцуе тым, хто збіўся са шляху праведнага, — летась літасць была праяўленая з нагоды 65-годдзя вызвалення Беларусі), прымеркаванай да 65-годдзя Вялікай Перамогі. Яе антыкарупцыйную скіраванасць акцэнтаваў, выступаючы ў Авальнай зале, **міністр унутраных спраў Анатоль КУЛЯШОЎ.** Ён праінфармаваў народных абраннікаў, што каля 2,2 тыс. людзей будуць вызваленыя з папраўчых установаў закрытага тыпу і 0,9 тыс. — адкрытага. Больш як дзевяці тысячам асуджаных скароцяць тэрмін заключэння.

Міністр перакананы, што амністыраванне не пагоршыць крымінагенную абстаноўку ў краіне. Апроч дару маральнага, ёсць падмога і матэрыяльная: утрыманне аднаго зняволенага абыходзіцца нам, падаткаплацельшчыкам, у 500 тыс. штомесяц (так леташняя амністыя, напрыклад, «вызваліла» ажно пяць млрд рублёў, а сёлета дзяржава вырашыла не эканоміць на пакаранні карупцыянераў усіх масцей). Зэканомленыя сродкі, паводле слоў міністра, застануцца ў сістэме Дэпартамента выканання пакарання, яны пойдуць на паляпшэнне ўмоў утрымання, забеспячэнне занятасці заключаных.

Здавалася б, суцэльныя плюсы, аднак у народных абраннікаў узнікла шмат пытанняў. Дэпутаты былі актыўныя і ў той кароценькі прамежак часу, калі законапраект рыхтаваўся да першага чытання, і падчас абмеркавання яго ў Авальнай зале. Яны цікавіліся маштабамі эканоміі, колькасцю рэцыдывіў у вызваленых злачынцаў, амністыраванымі з адкрытай формай сухотаў, інфекцыяй ВІЧ. Народныя абраннікі выступалі за амністыраванне людзей з анказахворваннямі, уздымалі пытанне аб неабходнасці дыферэнцыяцыі карупцыянераў паводле маштабаў злоўжывання...

Міністр паведаміў дэпутатам, што паўторныя злачынствы ўчыняе 7—10 адсоткаў амніставаных. Паводле яго прагнозу, гэты паказчык застанецца ў такіх жа межах і пасля сёлетняй амністыі. А ў гутарцы з журналістамі ён адзначыў: гэтыя 10 адсоткаў не даюць падставы гаварыць пра тое, што такі акт гуманізму не павінен здзяйсняцца.

Што да асобаў з адкрытай формай сухотаў, то, паводле слоў міністра, плануецца будаўніцтва спецыялізаванай бальніцы для лячэння такіх людзей на тэрыторыі папраўчай калоніі ў Оршы. Увогуле ж ёсць асобная ведамасная інструкцыя, у адпаведнасці з якой супрацоўнікі органаў унутраных спраў абавязаныя аказваць дапамогу медыкам (напрыклад, паводле звароту ўрача ўчастковы павінен даставіць на абследаванне хворага з адкрытай формай сухотаў).

У ніжняй палаце парламента законапраект курыруе камісія па нацыянальнай бяспецы на чале з **Віктарам ГУМІНСКІМ.** Ён назваў праяўлены дзяржавай акт гуманізму «публічнай дапамогай асуджаным, якія сталі на шлях выпраўлення». Аднак да карупцыянераў і іх адсутнасці ў пераліку амністыраваных ён непахісны. Сваю цвёрдую пазіцыю ён выказаў пасля пытання дэпутата **Анатоля ГЛАЗА** адносна мэтазгоднасці вызначэння нейкай планкі (размежавання карупцыянераў), бо сярод абвінавачаных у карупцыі «і выкладчыкі за 20 тысяч, і ўрачы... яны і так шэсць гадоў ні за што фактычна атрымалі». Віктар Гумінскі падкрэсліў, што пазіцыю МУС ён падтрымлівае і нагадаў калегу: «антыкарупцыйнае заканадаўства мы прымалі самі», і, маўляў, калі прынята рашэнне выкараняць зло, трэба яго выконваць...

Законапраект прадугледжвае вызваленне ад крымінальнай адказнасці і пакарання непаўналетніх, цяжарных жанчын, жанчын і адзіноkіх мужчын, якія маюць непаўналетніх дзяцей, асобаў пенсійнага ўзросту, інвалідаў, хворых на актыўную форму сухотаў, ВІЧ-інфіцыраваных, ветэранаў баявых дзеянняў, удзельнікаў ліквідацыі наступстваў аварыі на ЧАЭС, асобаў, якія атрымалі раненні пры выкананні абавязкаў у перыяд праходжання службы, якія здзейснілі злачынствы, што не адносяцца да катэгорыі цяжкіх.

Ад пакарання ў выглядзе арышту, абмежавання свабоды, накіравання ў дысцыплінарную воінскую часць, пазбаўлення волі могуць быць вызваленыя таксама іншыя катэгорыі асобаў пры асуджэнні за злачынствы, якія не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі (да двух гадоў пазбаўлення волі), а таксама пры асуджэнні да арышту — незалежна ад тэрміну адбытага пакарання; за менш цяжкія злачынствы (да шасці гадоў пазбаўлення волі) — пры адбыцці не менш за адну чвэрць тэрміну пакарання. Пры гэтым асуджаныя, якія здзейснілі іншыя катэгорыі злачынстваў і не падлягаюць вызваленню ад далейшага адбывання пакарання, вызваляюцца ад названых пакаранняў часткова тэрмінам на адзін год.

Азнаёмім вас і з поўным пералікам тых, каму амністыя «не пагражае»: асобы, да якіх раней прымянялася амністыя ці памілаванне і якія зноў здзейснілі наўмыснае злачынства; а таксама тыя, хто не пакрыў прычыненую злачынствамі шкоду (за выключэннем указанай льготнай катэгорыі асобаў), злосна парушае ўстаноўлены парадак падчас адбывання пакарання; прызнаныя асабліва небяспечнымі рэцыдывістамі; асуджаныя да пажыццёвага зняволення; якім смяротная кара ці пажыццёвае зняволенне замененыя іншым пакараннем; аб'яўленыя ў вышук у сувязі з ухіленнем ад адбывання пакарання; якія здзейснілі забойства, згвалтаванне, разбой ці вымаганне з кваліфікуючымі прыкметамі, а таксама бандытызм, тэрарызм, злачынствы супраць дзяржавы; якія стварылі злачынную арганізацыю ці ўдзельнічалі ў ёй, або якія здзейснілі карупцыйныя злачынствы з карыслівай зацікаўленасці; прыцягнутыя да крымінальнай адказнасці за кіраванне транспартным сродкам у стане ап'янення.

Праект закона падтрыманы ў першым чытанні абсалютнай большасцю народных абраннікаў (толькі двое прагаласавалі супраць), аднак ён будзе рыхтавацца да другога чытання, і прапановы парламентарыяў яшчэ могуць быць улічаныя... Па ўсёй краіне цяпер адбываюць пакаранне ў тых ці іншых формах каля 47 тысяч чалавек.

Зоя ВАРАНЦОВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ДАЧКА ПАШТАЛЬЁНА

У вёсцы Ваўкі і яшчэ чатырох населеных пунктах Пастаўскага раёна з'яўленне пашталёна Марыі Мацянёнак заўсёды чаканае. Са свежай прэсай гэты работнік сувязі спяшаецца да кожнага свайго падпісчыка. 7-гадовая дачка Ангеліна — першая матуліна памочніца, як у хатніх справах, так і ў газетна-паштовых.

З УСІМІ ПЫТАННЯМІ — ДА ЛЮДЗЕЙ У СІНІХ КАМІЗЭЛЬКАХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Вызначаць п'яных будзем візуальна. Калі ўзнікне неабходнасць, будзем адпраўляць іх на медыцынскі агляд.

Упершыню на мерапрыемствах такога ўзроўню будзе працаваць інфармацыйная служба.

— Па ўсіх пытаннях, якія могуць узнікнуць падчас свята, жыхары і госці сталіцы змогуць звярнуцца да супрацоўнікаў ГУУС Мінгарвыканкама, якія будуць апрануты ў спецыяльныя сінія камізэлькі. Да гэтых людзей будзе паступаць уся інфармацыя са штабаў, якія будуць працаваць у рэжыме рэальнага часу. Аналагічныя аператыўныя штабы будуць створаныя ва ўсіх абласных упраўленнях унутраных спраў. Інфармацыйныя службы таксама будуць працаваць не толькі ў Мінску.

Аляксандр Барсукоў таксама падкрэсліў, што ўвечары салют і канцэрты будуць ладзіцца не толькі ў раёне стэлы «Мінск — горад-герой». Аналагічныя мерапрыемствы будуць праходзіць яшчэ ў 6 месцах сталіцы. Таму, на яго погляд, не абавязкова ехаць з Кунцаўшчыны ці Уручча ў цэнтр горада.

— І яшчэ: у святочныя дні традыцыйна могуць узнікаць праблемы з месцамі для паркоўкі. Таму, па магчымасці, лепш пакідайце свой аўтамабіль дома. Тым больш што з-за заторaў дабірацца ў розныя месцы горада будзе хутчэй на метро. А ад метро можна і прайсці пешшу колькі метраў — гэта карысна для здароўя.

Узмоцнены кантроль за выкананнем ПДР усімі ўдзельнікамі дарожнага руху будзе весці асабісты састаў спецыяльнага падраздзялення ДПС «Страла».

9 мая падчас ранішніх святочных мерапрыемстваў, прысвечаных Дню Перамогі, будзе задзейнічана каля 4 тысяч супрацоўнікаў ГУУС Мінгарвыканкама. Супрацоўнікі міліцыі будуць несці службу ў парадной форме. Акрамя міліцыі, у святы ва ўзмоцненым рэжыме будуць таксама працаваць медыкі і выратавальнікі.

Надзея ДРЫЛА.

Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» – продавец (организатор аукциона) 21 мая 2010 года проводит открытый аукцион по продаже имущества с применением метода понижения начальной цены продажи

№ п/п	Сведения о предмете аукциона	Начальная цена предмета аукциона, бел. руб.	Место нахождения имущества	Сумма задатка, бел. руб.
Лот № 1	Баня (площадь 191 кв.м) Забор ж/б панелей 79 м² Мазутная (площадь 100 кв.м) Котельная (площадь 529,4 кв.м)	133 710 236	Могилевская область, Горецкий район, г. Горки, ул. Мира, 20А	13 371 024

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 26 34 24, 28 41 00.
2. Дата, время и место проведения аукциона: 21.05.2010 г. в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.
3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества от 28.05.2009 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
4. Информация о земельном участке: Площадь земельного участка – 1,3016 га, кадастровый номер – 722050200001006510.
5. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с 3012008900015 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Могилевской области, код 355, УНП 700049607, ОКПО 03454762.
6. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: 20.05.2010 г.; время: 17.00.
7. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
8. Сроки подписания договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона.
9. Извещения о проведении открытых аукционов с понижением начальной цены на 20 % и 50 % по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» опубликованы в газете «Звязда» № 212 от 10.11.2009 г., № 16 от 29.01.2010 г. с применением метода понижения начальной цены № 52 от 23.03.2010 г., № 71 от 10.04.2010 г.

Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» – продавец (организатор аукциона) 20 мая 2010 года проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества

№ п/п	Сведения о предмете аукциона	Начальная цена предмета аукциона, бел. руб.	Место нахождения имущества	Сумма задатка, бел. руб.
Лот № 1	Баня, площадь 49 кв.м Санаторный дом, площадь 614 кв.м Туалет, площадь 2,7 кв.м Сети наружного освещения 175,5 м Кабельная линия АВБбШВ-3х50 38,75 м Колодец из ж/б колец, глубина 69,6 м Ворота металлические, длина 4,25 м Фонтан, площадь 49,7 кв.м Дорожки пешеходные, площадь 134,6 кв.м	31 696 950	Могилевская область, Бобруйский район, д. Стасевка	3 169 695

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 23 64 24, 28 41 00.
2. Дата, время и место проведения аукциона: 20.05.2010 г. в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.
3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества от 28.05.2009 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
4. Информация о земельном участке: Площадь земельного участка – 0,7596 га, кадастровый номер – 720881206101000000.
5. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с 3012008900015 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Могилевской области, код 355, УНП 700049607, ОКПО 03454762.
6. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: 15.05.2010 г.; время: 17.00.
7. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
8. Сроки подписания договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона.
9. Извещения о проведении открытых аукционов по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» опубликовано в газете «Звязда» № 224 от 26.11.2009, № 65-66 от 03.04.2010, № 74 от 17.04.2010.

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА 14 мая 2010 года

№ лота	Наименование объекта/ Краткая характеристика объекта	Начальная цена продажи лота, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	Здание мебельного цеха и бытовых помещений, одноэтажное кирпичное здание общей площадью 1394,50 кв.м. Год постройки – 1967	131 458 333	6 573 000
2	Здание котельной общей площадью 91 кв.м (инв. № 340/С-001033)	26 116 020	1 306 000
3	Изолированное нежилое помещение (цех присадки ЩМД) общей площадью 179,4 кв.м.	49 326 707	2 466 000

Продавец имущества: управляющий БС СП ЗАО «Реан», адрес объектов: **г. Речица, ул. Луначарского, 97.**

Срок подачи заявления	**До 17.00 13 мая 2010 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а
Дата, время, место проведения аукциона	**14 мая 2010 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»
Номер р/с для перечисления залога	Р/с 3012035310012 в Филиал ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 331, УНП 102353509
Условие продажи	Без условий. Цены указаны без НДС. Вознаграждение – 5 % от цены продажи. Шаг торгов – 8 %.
Условие пользования	Объекты продаются в собственность

Дополнительная информация по тел.: 8 (0232) 77 37 27, 77 52 87 (факс)

Абзац

◢ Авіябомбы часоў Першай сусветнай вайны знойдзены ў Ашмянскім раёне. Боепрыпасы былі знойдзеныя пры правядзенні зямельных работ па пракладцы газапровода на станцыі Ашмяны ў жылым сектары па вуліцы Кастрычніцкай. Спачатку работнікі «Смаргоньсельгазбуда» ў выкапанай траншэі знайшлі пяць бомбаў. Выкліканыя на месца сапёры з дапамогай мінашукальніка знайшлі ў агульнай колькасці 13 авіяцыйных бомбаў і 76-міліметровы артылерыйскі снарад часоў Першай сусветнай вайны, а таксама дэтанатар і шэсць запалаў да гранат часоў Вялікай Айчыннай вайны. Тэрыторыю, дзе былі знойдзены боепрыпасы, ачапілі. Снарады вывезлі ў бяспечнае месца і абясшкодзілі.

◢ Пацыент цэнтральнай раённай бальніцы ў горадзе Ляхавічы загінуў, упаўшы з 4-га паверха. Яго цела выявілі ў ноч з 4 на 5 мая. Мужчына 1959 г.н. нідзе не працаваў. На момант трагедыі ён праходзіў лячэнне ў тэрапеўтычным аддзяленні. Спіртным не злоўжываў. Пракуратура праводзіць праверку. Пакуль асноўная версія — самагубства.

◢ Пракуратура Гродзенскай вобласці завяла крымінальную справу адносна дырэктара ААТ «Гроднарыба». Дырэктар падазраецца ў тым, што сёлета ў лютым-сакавіку яна дала ўказанне падначаленым перафасаваць пратэрмінаваную рыбную прадукцыю на Br50 млн у іншую тару з пазначэннем новага тэрміну годнасці. Тым самым нанесены ўрон правам і інтарэсам спажыўцоў.

Поўны абзац

◢ У эстонскім горадзе Палдыскі пяцігадовае дзіця задушыла на аўтамабілі 69-гадовую жанчыну. У рукі 5-гадовага хлопчыка нейкім чынам трапілі ключы ад бацькоўскага аўтамабіля Peugeot. Дзіця змагло завесці машыну, якая была прыпаркаваная з уключанай задняй перадачай. Як сцвярджаюць сведкі, аўтамабіль пачаў рухацца назад і наехаў на жанчыну. Ад удару жанчына ўпала і памерла ад атрыманых пашкоджанняў.

◢ У Запарожскай вобласці супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі аштрафавалі нябожчыка. Сям'і памерлага мелітопальца па пошце паведамілі, што на яго нерухомасць накладаецца арышт з-за няплаты штрафу ў 300 грыўняў за парушэнне ПДР. Як аказалася, машынай, што ўказаная ў дакументе, мужчына ніколі не валодаў, да таго ж парушэнне было здзейсненае ў маі 2009 года, тады як адрасат памёр яшчэ ў сакавіку 2007-га. Пасля высветлілася, што пры адпраўцы паведамлення чыноўнікі дапусцілі грубую памылку — у сапраўднасці штраф быў накладзены на іншага чалавека з такім жа прозвішчам.

◢ Цырульнік Кевін Алмонд з англійскага графства Кент забараніў кліентам весці размовы аб выбарах у брытанскі парламент. Такое рашэнне ён прыняў пасля таго, як у яго салоне ўспыхнула гучная спрэчка паміж прыхільнікам лейбарыстаў і кліентам, які падтрымлівае кансерватараў. Дайшло амаль што да рукапрыкладства. «Ад гэтай пары наша цырульня — зона, вольная ад размоў пра палітыку», — адзначыў Алмонд. Згодна з уведзенымі цырульнікам правіламі, кожны кліент, хто ўзняў тэму выбараў, павінен будзе заплаціць штраф. Сабраныя такім чынам грошы будуць перададзеныя на дабрачыннасць.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

СПК «КОЛХОЗ «АВАНГАРД»
ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ МАГАЗИНА,
расположенного по адресу: г. Осиповичи, ул. Дмитриева, д. 2а общей площадью 388,7 кв. м.
Срок регистрации участников — 1 месяц со дня выхода печатного издания.
Справки по тел.: 8(02235) 42 699, 8(029) 1461072, факс 8(02235) 23 191.
УНП 700028888

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА БЕЗ УСЛОВИЙ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ОБРАЩЕННОГО В ДОХОД ГОСУДАРСТВА

Адрес объекта и его наименование	- цех № 1, инв. № 631/С-57061, общей площадью 1 181,9 кв. м, год постройки – 1953, стены кирпичные, перекрытия железобетонные, крыша шиферная; - цех № 5, общей площадью 148,7 кв. м; инв. № 631/С-57060, год постройки – 1974, стены блочные, перекрытия деревянные, крыша шиферная; - цех № 3 (пилорама), инв. № 631/С-57058, общей площадью 231 кв. м, год постройки – 1953, стены блочные, крыша шиферная; - мастерские, инв. № 631/С-57057, общей площадью 148,7 кв. м, год постройки – 1987, стены кирпичные, перекрытия деревянные, крыша шиферная; - котельная, инв. № 631/С-57059, общей площадью 157,5 кв. м, год постройки – 1955, стены кирпичные, перекрытия железобетонные, крыша – совмещенная, гудрон; - конюшня общей площадью 50,6 кв. м, год постройки – 1953, стены бревенчатые, крыша шиферная; - проходная общей площадью 15 кв. м, год постройки – 1988, стены кирпичные, крыша шиферная; - беседка общей площадью 8,9 кв. м, год постройки – 1988, стены деревянные. Объекты расположены по адресу: Минская обл., Вилейский район, деревня Куренец. На территории имеются все виды инженерных коммуникаций. Объекты продаются одним лотом. Начальная цена – 171 594 000 рублей. - ангар 1, расположенный по адресу: Минская обл., Воложинский р-н, участок Троки, общей площадью 800 кв.м. Начальная цена – 109 593 000 рублей. - ангар 2, расположенный по адресу: Минская обл., Узденский р-н, п. Смолзавод общей площадью 240 кв.м. Начальная цена – 25 434 000 рублей. - цех переработки молока, общей площадью 569,9 кв.м, гараж общей площадью 92,3 кв.м, год постройки – 1980, административное здание общей площадью 21 кв.м, год постройки – 1980, расположенные по адресу: Минская обл., Воложинский р-н, г.п. Ивенец. Начальная цена – 191 241 000 рублей. - слесарно-инструментальная мастерская, общей площадью 819 кв.м, год ввода в эксплуатацию-1990; столовая, общей площадью 246,6 кв.м, год ввода в эксплуатацию – 1959; клуб, общей площадью 256,5 кв.м, год ввода в эксплуатацию – 1964; баня, общей площадью 118,8 кв.м, год постройки – 1968, расположенные по адресу: Минская обл., Столбцовский р-н, д. Клетище.

ПАНЯДЗЕЛАК, 10 МАЯ

ПЕРШЫ

7.20 Мультфільм «Дзюймовачка».
7.50 «Добрай раніцы, Беларусь!».
9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
9.05 Nota Bene.
9.35 У свеце матораў.
10.00 Кінааповесць «Беларускі вакзал».
12.10 Дак. цыкл «Вялікая вайна». «Курская дуга».
13.00, 15.30 Драма «На безыменнай вышыні».
15.10 Навіны рэгіёна.
17.25 Дак. цыкл «Фартыфікацыя».
18.05 «Культурныя людзі».
18.35 «Арэна».
19.15 «OFF STAGE LIFE».
19.30 «КЕНО».
19.35 Канцэрт Валерыя Ляонцьева.
21.00 Панарама.
21.40 Меладрама «Зайздрасць багоў».

АНТ

7.00 «Наша раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 20.30 Нашы навіны.
9.05 Контуры.
10.10 «Здароўе».
10.55 Пакуль усе дома.
11.50 «Шчасце ёсць!».
12.40 «Фазэнда».
13.20 Камедыя «Дачная паездка сяржанта Цыбулі».
15.00 Песні нашай Перамогі. «Дзень Перамогі».
16.15, 21.00 Навіны спорту.
16.20 Серыял «Дыверсант».
21.05 «Здабытак рэспублікі».
0.05 «Каралеўскія канікулы». Дак. фільм.

ЛАД

6.50 Кінааповесць «Дзяўчынка шукае бацьку».
8.15 Маналогі пра вайну.
8.25 «Зорка». Гала-канцэрт лаўрэатаў тэлевізійнага фестывалю армейскай песні.
9.45 У гэты дзень.
9.50 Дак. фільм «Лінія жыцця. Урачы вайны».
10.20 Драма «Рабінавы вальс».
12.10 Дак. фільм «Выпускны на мінным полі».
12.40 Маналогі пра вайну.
12.50 «Пра мастацтва».
13.15 Экспедыцыя. Выбранае.
13.20 «Памяць. Векапомныя дні былых франтавікоў».
13.50 Пазакласная гадзіна.
14.05 Бухта капітанаў.
14.45 Кінараман «Лёс».
17.45 «Мы — беларусы». Канцэрт.
18.50 Маналогі пра вайну.
19.00 Драма «Тарпеданосцы».
20.50 Калыханка.
21.10 Хакей. Чэмпіянат свету. Германія — Фінляндыя.
23.30 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
0.25 Жывы гук.

СТБ

6.50 Маст. фільм «Салдаты».
8.30 «Тыдзень».
9.35 «Вялікае сняданне».
10.05 «Званая вячэра».
11.00 «Вялікі горад».
11.40 «Зорны рынг». Аляксандр Маршал супраць групы «ATLANTICA».
12.50 Маст. фільм «Паляванне на Вервольфа».
16.30, 19.30 «24 гадзіны».
20.40, 2.30 Маст. фільм «Таксі-блюз».
22.30, 4.30 Меладрама «Святло ў акне».

ДОМ КІНО

3.00, 11.00, 19.00 Серыял «Іншае жыццё».
3.50 Новы хіт. Ваенная драма «Вышыня 89».
5.35 Ура, камедыя! «Афоня».
7.05 Меладрама «Здзяйсненне жаданняў».
8.40 Фільм-катастрофа «Экіпаж».
11.50 Камедыя «Добра сядзім!».
13.05 Дэтэктыў «Справа № 306».
14.20 Золата «Масфільма». «Інтэрдзяўчынка».
16.45 Золата «Масфільма». «Па сямейных абставінах».
19.50 Новы хіт. Дэтэктыў «Сціскс».
21.25 Камедыя «Карнавал».
23.50 Фантастыка. «Гіпербалоід інжынера Гарына».
1.25 Прыгодніцкі фільм «І на Ціхім акіяне...».

ТБ-21

9.00, 17.00, 1.00 Камедыя «Так, сястра! Не, сястра!».
10.45, 18.45, 2.45 Драма «Рабі — раз».
12.15, 20.15, 4.15 Трылер «Чорная скрыня».
13.45, 21.45, 5.45 Драма «Дзяўчына з жамчужнай завушніцай».
15.30, 23.30, 7.30 Камедыя «11.14».

ТБ1000

3.00 Камедыя «Сэнс жыцця па Монці Пайтану».
4.30 Меладрама «2046».
7.00 Трагікамедыя «Дуэты».
9.00 Камедыя «Джым з Пікадзілі».
11.00 Камедыя «Сустрэча, якая не адбылася».
13.00 Камедыя «Чароўная Марта».
15.00 Драма «Дарагі Фрэнкі».
17.00 Трагікамедыя «Мяне завуць Рыд Фіш».
19.00 Камедыя «Толькі ты і я».
21.00 Драма «Сямейная тайна».
23.00 Драма «Справы ў Ньюджэрсі».
1.00 Трагікамедыя «Апошняе жыццё ў Сусвеце».

ТБЗ

5.00 М/ф «Том і Джэры. Дзіцячыя гады».
5.30 М/ф «Кураж — баязлівы сабака».
6.00 М/ф «Пінкі і Брэйн».
6.30 М/ф «Бэтмен будучыні».
7.00, 14.00 «Альф». Серыял.
8.00, 17.00 «Прытворшчык». Серыял.
9.00 «Горад прышэльцаў». Серыял.
10.00 Маст. фільм «Горад у агні».
12.00 Д/ф «Мяшчоўск. Тайна царскіх нявестаў».
13.00 Разбуральнікі міфаў.
15.00 «На краі сусвету». Серыял.
16.00 «Згублены свет». Серыял.
18.00 Маст. фільм «Сківіцы 2008. Мутанты».
21.15 Разбуральнікі міфаў.
23.15 «Зорныя вароты: Атлантыда». Серыял.
0.15 «Менталіст». Серыял.
1.00 Маст. фільм «Стварэнні з бездані».
3.00 «Бафі — знішчальніца вампіраў». Серыял.
4.00 Пакой страху.

РАМАНТЫКА

7.00, 18.40, 5.20 «Рэванш-II».
7.55, 2.40 «Кахаючае сэрца».
8.50, 14.10, 0.55 «Жонка Іуды».
9.45, 15.05, 3.35 «У пошуках бацькі».
10.40, 20.30 «Плата не па заслугах».
11.30, 16.55, 17.45, 21.20 «Прывітанне, красуня».
12.25, 1.50, 6.10 «Тайна Лауры».
13.20, 23.05, 4.30 «Мая Папялушка».
16.00, 19.35, 22.10 «Тайны кахання».
0.00 «Парадоксы кахання».

HALLMARK

0.10, 4.10, 23.20 Серыял «Аддзел мокрых спраў-II».
1.00, 7.10 Маст. фільм «Кім замяніць тату».
2.30, 5.40 Серыял «Вайна Фойла».
5.00, 10.10 Серыял «Дочкі Маклеода-VII».
8.40 Маст. фільм «Шэная».
11.50 Дэтэктыў «Забойствы ў Мідсамеры-XI».
13.30 Серыял «Зачараваныя-VII».
14.20 Серыял «Сапраўдныя хатнія гаспадыні Нью-Ёрка».
15.10 Маст. фільм «Ева».
16.40 Серыял «Людзі ў дрэвах-II».
18.20 Серыял «Быць Эрыкай-II».
20.00 Маст. фільм «Забойства наўме».

ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

5.00, 9.00, 13.00 Маст. фільм «Ягорка».
6.10, 10.10, 14.10 М/с «Ванюша і велікан». Зборнік м/ф: «Паштовая рыбка», «Міця і мікробус», «Прыгоды Чычыкава. Манілаў».
7.00, 11.00 Казкі Андэрсэна. «Дзюймовачка». Зборнік м/ф: «Скрадзены месяц», «Зялёны конік».
8.00, 12.00 М/с «Перастань мяне смяшыць». Зборнік м/ф: «Каралеўскі бутэрброд», «Мішка-задзірака», «Як ослік на сум захварэў».
15.00 Меладрама «У маёй смерці прашу вініць Клаву К.».
16.15 М/с «Трое з Прастаквашына». Зборнік м/ф: «Дзе ж медзведзяня?».
17.00 Казкі Андэрсэна. «Пастушка і камінар». Зборнік м/ф: «Самы галоўны», «Вожык павінен быць калючым?».
18.00 М/с «Перастань мяне смяшыць». Зборнік м/ф: «Кім быць?», «Стары і журавель».

ЗДАРОЎЕ

5.00, 17.00 Набалелае пытанне.
5.40, 17.40 Кабінет прыгажосці.
6.10, 18.10 Невядомы дыягназ.
7.00, 21.00 Тайны медыцыны.
7.35, 21.35 Як вы сябе адчуваеце?
8.05, 22.05 Як пражыць даўжэй.
9.00, 23.00 Цела чалавека.
9.30, 23.30 Жаночы часопіс.
10.05, 0.05 Няёмкія хваробы.
11.00, 1.00 Хто старэе хутчэй?
11.30, 1.30 Як памаладзець.
12.00, 2.00 Я чакаю дзіця.
12.30, 2.30 Гісторыя хваробаў.
13.00, 3.00 Вялікая прабежка.
13.30, 3.30 Цела і кроў.
14.25, 4.25 Я перамог гэты боль.
15.00 Не выходзячы з дому.
15.30 Ты тое, што ты ясі.
16.00 Выдаткі вытворчасці.
16.30 Школа розуму.
19.00 Я расту.
19.35 Сакрэты здароўя.
20.00 Практыка здароўя.
20.30 Панацэя.

ТДК

6.00, 7.50, 10.50, 11.50, 13.00, 14.00, 14.50, 16.50, 17.50, 18.50, 22.00 Парады ТДК.
6.25, 3.00 Гісторыя поспеху.
7.25, 10.00, 17.00 Красуня.
7.50 Сакрэты здароўя.
8.00 Добрай раніцы, Каханая!
9.00, 14.50, 16.50, 17.50, 18.50, 22.00 Парады ТДК.
9.15, 18.00, 22.00, 3.50 Разбуральнікі легендаў.
10.10, 2.55, 6.05 Вынайсці будучыню.
11.05, 19.00, 5.10 Як гэта зроблена?
11.35, 19.30, 5.40 Як гэта працуе.
12.00 Самыя моцныя інструменты.
12.55, 20.00, 0.30 «Top Gear».
13.50 Амерыканскі чопер.
16.10 Крутыя лесарубы.
17.05 Дзёрзкія праекты.
21.00, 1.30 Заводскія будні.
23.00, 2.25 Скрыўленне часу.
0.00, 4.45 «Маланкавыя катастрофы».

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00 «Ідэальная зброя».
6.00 «Малпы ў горадзе!».
7.00, 12.00 «На кручку».
9.00 «Малпы-зладзюжкі».
10.00, 17.00 «Мегазаводы».
11.00, 19.00, 1.00 «Секунды да катастрофы».
11.30, 1.30 «Зона будоўлі».
14.00 «Следства па справах драпежнікаў».
15.00 «Самыя небяспечныя жывёлы».
16.00, 4.00 «Ратаванне Парфенона».
18.00 «Кітайскі Лас-Вегас».
20.00, 22.00, 2.00 «З пункту гледжання навукі».
21.00, 0.00, 3.00 «Туземцы ў ЗША».

TRAVEL

7.00, 12.00, 16.00, 19.00, 23.00, 1.00, 4.00 Сусветны падарожнік.
8.00 Раскошныя падарожжы з Варунам Шармай.
9.00, 15.00 Лепшыя падарожжы.
9.30, 15.30, 22.30, 3.30 Культурны шок.
10.00, 18.00, 5.00 Планета ежы.
11.00, 13.30, 0.30, 6.00 Прагны вандроўнік.
11.30, 17.00, 0.00 Пра галоўнае.
13.00, 17.30 Шэф-кухар за мяжой.
14.00 Падарожжы па месцах вінаробства.
14.30 Культура і кухня Лацінскай Амерыкі.
21.00, 2.00 У канчатковым выніку.
22.00, 3.00, 6.30 Раз'юшаная планета.

ANIMAL PLANET

7.00, 14.35 «SOS дзікай прыроды».
7.25, 13.10 «Ветэрынарная «хуткая дапамога».
7.50, 15.30, 19.10, 23.50 Востраў арангутангаў.
8.15, 15.55, 19.40, 0.15 Смутны час у горадзе малпаў.
8.45 Прыгоды Осціна Сцівенса.
9.40, 17.20, 5.45 «Хітрыкі малпаў».
10.05, 16.25 «Самыя забаўныя жывёлы планеты».
10.55, 17.45 «Жыццё малпаў».
11.20, 15.00, 6.35 «Шатландскае таварыства абароны жывёл».
11.50, 4.25 Тэрыторыя жывёл.
12.45, 6.10 Ветэрынары-стажоры.
13.40, 22.55, 3.30 Паліцыя Маямі — аддзел па абароне жывёл.
18.15 Сямейнае сафары.
20.10, 0.45 «Паліцыя Х'юстана — аддзел па абароне жывёл».
21.05, 1.40 Дзікія і небяспечныя.
22.00, 2.35 Кітовыя войны.
5.20 Палі звярыных бітваў.

EUROSPORT

9.30, 1.00 Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краіны-удзельніц.
9.45 Вось гэта дзіва!!!
10.00, 15.45, 1.15 Веласпорт. Giro d'Italia.
11.00, 18.30, 20.10 Тэніс. Турнір WTA.
20.00, 0.45 Футбол. Еўрагалы.
22.45 Боўлінг.
23.45 Самыя дужыя людзі планеты.

MTV

5.00, 1.30 Musik.
6.00 «Стэрэа_раніца».
8.50, 16.30 Бобыск і спатканне.
9.15, 16.55 Наступны.
9.40 Тайныя спакусы курорт-нага гатэля.
10.05 Трэндзі.
10.35 «Губка Боб квадратныя штонікі».
11.00, 17.30 Спатканне на выжыванне.
11.25 Руская дзясятка.
12.20, 23.00 News блок.
12.30, 0.05 Мадэльная школа ведзьмы Джэніс.
13.00, 20.00 «Подыум».
13.55 Ужо можна.
14.20 Па дамах: залатыя дзеткі.
14.45, 19.05 «Пляж».
15.35 Тачку на пракачку.
16.00 Ікона відэагульняў.
18.00, 20.55 «Сэкс у вялікім горадзе». Серыял.
18.35, 21.25 «Распусная Каліфорнія».
22.00 «Клініка». Серыял.
22.30 Трэндзі.
23.10 «Сэкс» з Тэкілай. Двайная спакуса.
0.30 Вясёлы мясатрас.
1.00 «Паўднёвы парк».

ІНТЭР+

7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 12.00 Навіны.
7.10 Раніца з Інтэрам.
9.15 Бацькі, якія кормяць.
9.20 Маст. фільм «Цішэй берагі».
10.45, 18.05, 4.20 Серыял «Суседзі».
11.10 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
12.10 Я ўсё пра Вас ведаю.
13.05 Ключавы момант.
13.50 Знак якасці.
14.20, 1.15 Інверсія. С. Мядзведзева.
15.00 Феерыя падарожжаў.
15.20, 0.00 Маст. фільм «Дума пра Каўпака. Карпаты».
16.35 Серыял «Мачаха».
17.20 Пазавочы. В. Зяленскі.
18.30, 4.45 Судовыя справы.
19.15, 2.15 Серыял «Кармеліта».
20.00, 3.00 «Падрабязнасці».
20.30, 3.30 Серыял «Асуджаная стаць зоркай».
21.30 Вялікая палітыка з Яўгенам Кісялёвым.
1.50 Не першы погляд.
4.45 Украінская топ-дваццатка.
6.00 Легенды бандыцкага Кіева.
6.30 Феерыя падарожжаў.

0.15 ФІЛЬМ ДНЯ

"МАДАМ ІРМА" (ФРАНЦЫЯ, 2006 г.)

Камедыя пра беспрацоўнага топ-менеджара, які выратаваў прыкінуцца жанчынай і пад выглядам вараўбіткі зарабляць сабе на жыццё.

Рэжысёры — Дзідзье Бурдон, Іў Файнберг. **У ролях:** Дзідзье Бурдон, Паскаль Лежыцімус, Катрын Мушэ, Жулі Фер'е.

СУБОТА, 15 МАЯ

ПЕРШЫ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 19.00 Навіны.
6.05 Дзень спорту.
6.10, 7.10, 8.15 «Добрай раніцы, Беларусь!».
7.05, 8.10, 14.35 Зона Х.
7.30, 11.55 Дзелавое жыццё.
8.35 Існасць.
9.05 Здароўе.
9.40 Дак. цыкл «Зорнае жыццё». «Зоркі і рэлігія».
10.30 Шпілька.
11.00 Ранішняя хваля.
11.40 «OFF STAGE LIFE».
12.10 Дэтэктыў «Пастка для адзінокага мужчыны».
14.05 «ПАР-2010». Французскі акцэнт.
15.15 Навіны рэгіёна.
15.30 Вакол планеты.
16.15 Дак. цыкл «Фартыфікацыя».
17.10 «Бялыніцкія таямніцы» цыкла «Зямля беларуская».
17.25 «Даруй мне».
18.00 «Ваша лато».
18.50 Латарэя «Пяцёрачка».
19.25 «КЕНО».
19.30 «Зорныя танцы».
21.00 Панарама.
21.40 Драма «Мірны воін».
23.55 Уласнай персонай.
0.20 Хакей. Чэмпіянат свету.
14.55 Драма «Прапажа алмаза «Сляза».
16.55 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Шахцёр (Салігорск) — БАТЭ (Барысаў).
19.10 Баявік «Васабі».
21.10 Хакей. Чэмпіянат свету.
23.30 Жывы гук.
0.10 Самба. Чэмпіянат Еўропы.

СТБ

6.25 «Анфас».
6.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
8.00 Маст. фільм «Летнія ўражанні аб планеце Z».
9.10 «Скардзіцца дазволена».
9.30 «Культурнае жыццё».
10.00 «Крокі да поспеху».
10.55 «Мінск і мінчане».
11.30 «Новыя падарожжы дылетанта».
12.00 Маст. фільм «Месца сустрэчы змяніць нельга».
15.50 «Відзьма-нявідзьма».
16.30, 19.30 «24 гадзіны».
16.45 «Наша справа».
17.00 «Вялікі горад».
17.45 Маст. фільм «Жаночая дружба».
20.00 «СТБ-спорт».
20.10 «Зорны рынг». Валерый Гаіна супраць Аляксандра Саладухі.
21.25 Маст. фільм «Парфумер: гісторыя аднаго забойцы».
0.00 «Парад феерверкаў».
1.35 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

АНТ

7.00 «Суботняя раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 20.30 Нашы навіны.
9.05 Серыял «Мая цудоўная нянька».
9.45 «Здароўе».
10.30 «Смак».
11.10 Асяроддзе пражывання. «Што цячэ з крана».
12.10 «Саюз».
12.40 Анімацыйны фільм «Гарбун з Нотр-Дама».
14.05 «Кінаметры вайны». «Рэцэпт Перамогі. У небе «начныя ведзьмы».
14.35 «У небе «начныя ведзьмы». Маст. фільм.
16.15, 21.00 Навіны спорту.
16.20 «Мая радаслоўная. «Аляксей Булдакоў».
17.10 Маст. фільм «Мужчына павінен плаціць».
18.55 «Адзін супраць усіх».
19.55 «Чакай мяне». Беларусь.
21.05 Драма «Індзі».
22.55 «Пражэктарперысхілтан».
23.30 «Што? Дзе? Калі?».
0.40 Маст. фільм «Коркі Рамана».

ЛАД

6.55 «Смачна з Барысам Бурдой».
7.20 Усё пра бяспеку.
7.50 Тэлепорт.
8.15 Нашы тэсты.
9.00 Жансавет.
9.40 Свая кампанія.
10.25 «Лабірынты: драўляныя храмы Прыкарпацця».
10.55 «Страсці па культуры».
11.40 Серыял «Яшчэ адзін шанц».
14.55 Драма «Прапажа алмаза «Сляза».
16.55 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Шахцёр (Салігорск) — БАТЭ (Барысаў).
19.10 Баявік «Васабі».
21.10 Хакей. Чэмпіянат свету.
23.30 Жывы гук.
0.10 Самба. Чэмпіянат Еўропы.

СТБ

6.25 «Анфас».
6.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
8.00 Маст. фільм «Летнія ўражанні аб планеце Z».
9.30 «Культурнае жыццё».
10.00 «Крокі да поспеху».
10.55 «Мінск і мінчане».
11.30 «Новыя падарожжы дылетанта».
12.00 Маст. фільм «Месца сустрэчы змяніць нельга».
15.50 «Відзьма-нявідзьма».
16.30, 19.30 «24 гадзіны».
16.45 «Наша справа».
17.00 «Вялікі горад».
17.45 Маст. фільм «Жаночая дружба».
20.00 «СТБ-спорт».
20.10 «Зорны рынг». Валерый Гаіна супраць Аляксандра Саладухі.
21.25 Маст. фільм «Парфумер: гісторыя аднаго забойцы».
0.00 «Парад феерверкаў».
1.35 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

АНТ

7.00 «Суботняя раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 20.30 Нашы навіны.
9.05 Серыял «Мая цудоўная нянька».
9.45 «Здароўе».
10.30 «Смак».
11.10 Асяроддзе пражывання. «Што цячэ з крана».
12.10 «Саюз».
12.40 Анімацыйны фільм «Гарбун з Нотр-Дама».
14.05 «Кінаметры вайны». «Рэцэпт Перамогі. У небе «начныя ведзьмы».
14.35 «У небе «начныя ведзьмы». Маст. фільм.
16.15, 21.00 Навіны спорту.
16.20 «Мая радаслоўная. «Аляксей Булдакоў».
17.10 Маст. фільм «Мужчына павінен плаціць».
18.55 «Адзін супраць усіх».
19.55 «Чакай мяне». Беларусь.
21.05 Драма «Індзі».
22.55 «Пражэктарперысхілтан».
23.30 «Што? Дзе? Калі?».
0.40 Маст. фільм «Коркі Рамана».

ЛАД

6.55 «Смачна з Барысам Бурдой».
7.20 Усё пра бяспеку.
7.50 Тэлепорт.
8.15 Нашы тэсты.
9.00 Жансавет.
9.40 Свая кампанія.
10.25 «Лабірынты: драўляныя храмы Прыкарпацця».
10.55 «Страсці па культуры».
11.40 Серыял «Яшчэ адзін шанц».
18.40 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
19.30 «Прафесія — рэпарцёр».
20.00 «Праграма Максімум».
21.10 «Рускія сенсацыі».
22.05 «Ты не паверыш!».
23.05 Баявік «Антыкілер ДК».
0.45 Меладрама «Любоўны настрой».

8 КАНАЛ

9.00 «К-гульні».
9.10, 23.35 «Надвор'е».
9.15 «Грэцыя вачыма гурмана».
9.45 «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
10.00 Камедыя «Знаёмства з бацькамі».
11.45 «Пляткарка».
12.00 Маст. фільм «Чорны жарабец».
14.15 «Кіна-ляп».
14.30 «Мультпарад па выхадных.
16.00 «Адшукваецца адпачынак».
16.30 «Серыял «Палюбоўнікі пустыні».
17.45 «Навіны кіно».
18.00 Серыял «Справядлівая справа».
19.00 Камедыя «Ягуар».
20.50 «Вечарніца».
21.05 «К-гульні» — «Лайт».
21.10 Драма «У цвярозым розуме і цвёрдай памяці».
23.25 «Кіно—кліп—парад».

ВТБ

6.00, 23.30 «PLAY».
10.30 Серыял «Татавы дочкі».
13.00 Серыял «Ранеткі».
16.00 Маст. фільм «Шасціструнны самурай».
18.00, 22.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
20.00 Драма «Спявак».

РТР—БЕЛАРУСЬ

4.55 «Білет на сёння».
5.05, 13.00 Серыял «Трыццаць выпадкаў з жыцця маёра Земана».
6.00, 11.10 «Любімыя акцёры».
6.15, 11.25 Маст. фільм «Пра дракона на балконе».
7.30, 12.45 М/ф.
8.00 М/с «Паляўнічыя на драконаў».
8.30 «Эксперыментатары».
8.45 «Мільён пытанняў аб прыродзе».
9.00, 15.00, 18.00 Навіны Садружнасці.
9.10, 3.35 «Смачны свет».
9.40 Серыял «Гвен Джонс — вучаніца Мерліна».
10.10 «Мар, дзейнічай, будзь!».
10.40 «Даведнік».
14.00, 0.15 «Дакументальны дэтэктыў».
15.10 «Саюзнікі».
15.40, 1.45 Маст. фільм «Царазабойца».
17.45 «Рэспубліка сёння».
18.20 Маст. фільм «Адчыніце, паліцыя!-2».
20.15 Простыя лічбы.
21.00, 1.15 «Навіны Садружнасці. Культура».
21.30, 4.00 «Асабістыя рэчы з Андрэем Максімавым».
22.30 Серыял «Таямнічыя гісторыі Эдгара Алана По».
23.45 «Пра што не прынята гаварыць».
7.00, 11.00, 14.00, 19.00 Весткі.
7.10 «Набытак рэспублікі».
7.25 Маст. фільм «Падарунак адзінокай жанчыне».
8.45 Меладрама «Танга на два галасы».
10.25 «Ранішняя пошта».
11.10 «Суботнік».
11.50 Маст. фільм «Цячэ рака Волга».
13.30 «Гарадок».
14.30 «В огнедышащей лаве любви. Святлана Святлічная». Дак. фільм.
15.20 Камедыя «Душачка».
16.55 «Суботні вечар».
19.45 «Юбілейнае шоу Надзеі Кадышавай «Запальваем зноў».
22.40 Маст. фільм «Гувернантка».
0.30 Маст. фільм «Блюз ліса, якое ападае».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

7.35 «Казкі Бажэнава».
7.55 Мультфільм.
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.20 «Авіятары».
8.50 «Агляд».
9.25 «Без рэцэпта».
10.25 «Галоўная дарога».
10.55 «Кулінарны паядынак».
11.55 «Кватэрнае пытанне».
13.25 «Жаночы погляд». Святлана Святлічная.
14.15 Камедыя «Як знайсці ідэал».
16.15 «Суд прысяжных: Галоўная справа».
17.45 «Вочная стаўка».
18.40 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
19.30 «Прафесія — рэпарцёр».
20.00 «Праграма Максімум».
21.10 «Рускія сенсацыі».
22.05 «Ты не паверыш!».
23.05 Баявік «Антыкілер ДК».
0.45 Меладрама «Любоўны настрой».

ТНТ

5.00 «Гэй, Арнольд!». М/с.
6.00 «Сапраўдныя монстры». М/с.
7.25 «Саша + Маша». Серыял.
8.00 «Інтуіцыя».
9.00 «Школа рамонту».
10.00 «Сляпое каханне». Д/ф.
11.00 «Камедзі Клаб».
12.30 «Жаночая ліга. Бананавы рай».
13.00 «Cosmopolitan». Відэаверсія».
14.00 «Універ». Сітком.
16.00 «Пасля захаду сонца». Баявік.
18.00, 20.50 «Наша Russia».
19.00 «Брус Усемагутны». Камедыя.
22.00, 1.00 «Дом-

НЯДЗЕЛЯ, 16 МАЯ

ПЕРШЫ

7.15 Казка «Бібі — маленькая чараўніца».
9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
9.05 «Арсенал».
9.35 «Зброя».
9.50 Альманах падарожжаў.
10.15 «Культурныя людзі».
10.50 «У свеце матораў».
11.25 Nota Bene.
12.10 Камедыя «Старыя-разбойнікі».
14.00 «ПАР-2010. Бітвы кантынентальных культур».
14.30 Дак. цыкл «Гарачыя кропкі».
15.10 Навіны рэгіёна.
15.30 «Якія спяваюць камерата».
15.55 Меладрама «Манро».
17.40 OFF STAGE LIFE.
18.00 Суперлато.
19.15 Дак. цыкл «Мая праўда». «Барыс Маісееў. Птушачка».
20.30 «Спортлато 5 з 36».
20.50 «КЕНО».
21.00 «У цэнтры ўвагі».
22.10 «Футбол. Ліга чэмпіёнаў». Відэачасопіс.
22.40 Камедыя «Мігель і Уільям».

АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 Нядзельная прапаведзь.
9.20 Серыял «Мая цудоўная нянька».
9.55 «Бесталковыя нататкі».
10.15 Пакуль усе дома.
11.10 «Шчасце ёсць!».
12.00 «Ранішняя пошта».
12.35 «Фазэнда».
13.15 «Разумніцы і разумнікі».
14.00 «Песні Перамогі». «Разгром паўднёвага фронту».
14.30 «Градка».
15.05 Севастопальскія апавяданні. «За Веру, Царград і Айчыну».
16.15 Навіны спорту.
16.20 «Гарады-героі. Смаленск».
17.10 Маст. фільм «Валерый Харламаў. Дадатковы час».
18.55 «Давай пажэнімся!».
20.00 Контуры.
21.05 «Дыханне планеты».
21.40 Драма «Віцэ-каралі».

ЛАД

7.10 Звон.
7.35 Мір вашаму дому.
7.45 «Смачна з Барысам Бурдой».
8.15 Баявік «Васабі».
9.55 Школа рамонту.
11.00 Урачэбныя тайны з доктарам А. Цярэшчанкам.
11.45 Кінапробы.
12.05 Бухта капітанаў.
12.45 «Правы чалавека».
13.00 Маст. фільм «Востраў згубленых душ».
15.05 Дак. цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання».
16.05 Баявік «Сем мячоў».
19.00 Нашы тэсты.
19.35 Экспедыцыя.
20.05 Смешная часінка.
20.45 Тэлебарометр.
21.10 Хакей. Чэмпіянат свету.
23.30 Свая музыка. Працяг.
23.55 ПРАсоўванне+.
0.15 Самба. Чэмпіянат Еўропы.

СТБ

7.30 Серыял «Афрамаскавіч».
8.20 Маст. фільм «Летняя ўраганні пра планету Z». Заключная серыя.
9.30, 19.00 «Аўтапанарама».
10.00 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
10.50 «Вялікае сненданне».
11.30 «Салдаты. Залатыя серыі».
13.15 «Добры дзень, доктар!».
13.45 Маст. фільм «Месца сустрэчы змяніць нельга». Заключная серыя.
16.30 «24 гадзіны».
16.50 «Ля параднага пад'езда».
17.20 Канцэрт Міхаіла Задорнава.
19.30 «Тыдзень».
20.40 Маст. фільм «Дамы ў ліловым».
22.45 «Прафесійны бокс».
23.40 Маст. фільм «Затоічы».
1.40 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

МІР

4.55 «Білет на сёння».
5.05, 13.00 Серыял «Трыццаць выпадкаў з жыцця маёра Земана».
6.00, 11.00 «Любімыя акцёры».
6.15, 11.25 Маст. фільм «Толькі ў мюзік-холе».
7.40 М/ф.
8.00 М/с «Паляўнічыя на драконаў».
8.30 «АБВГДэйка».
9.00, 15.00 Навіны Садружнасці.
9.10 «Свет анімацыі — анімацыя свету».
9.40 Серыял «Гвен Джонс — вучаніца Мерліна».
10.10 «Ведаем рускую».
14.00, 0.15 «Дакументальны дэтэктыў».
15.10 «Дыяспары».
15.40, 1.45 Маст. фільм «Брытанік».
17.25, 3.30 Простыя лічбы.
17.50 «Правілы вінаробаў».
20.00 «Разам».
21.00, 1.15 «Паўночнікі».
21.40, 4.00 Канцэрт.
22.40 Серыял «Таямнічыя гісторыі Эдгара Алана По».
23.45 «Даведнік».

8 КАНАЛ

9.00, 23.35 «Надвор'е».
9.15 «Мой любімы гадаванец».
9.45 ВаенТБ прадстаўляе...
10.15 «Адшукваецца адпачынак».
10.45 Драма «У цвярозым розуме і цвёрдай памяці».
12.45 «Пляткарка».
13.00 «Яна напісала забойства».
14.45 «К-відэа» для дзяцей.
15.05 Фільм — дзяцям «Марыя Мірабэла».
16.30 Серыял «Палюбоўнікі пустыні».
17.30 «Бульбокс».
18.00 Серыял «Справядлівая справа».
19.00 Камедыя «Чарлі Біблз».
20.50 «Вечарніца».
21.05 «К-відэа» для ўсёй сям'і.
21.10 Камедыя «Лысы нянька».
23.20 «Навіны кіно».

ВТБ

6.00, 23.00 «PLAY».
10.30, 22.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
13.00 Серыял «Ранеткі».
15.00 Драма «Спявак».
17.30 Серыял «Татавы дочкі».
20.00 Камедыя «Вундэркінды-2».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
7.55 Камедыя «Бацькі і дзяды».
9.20 Маст. фільм «Гувернантка».
11.00, 14.00, 19.00 Весткі.
11.10 «Сам себе рэжысёр».
12.10 Маст. фільм «Ранняя ржа».
14.15 «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
14.45 «Украінскі самурай. Прынцып Ступкі». Дак. фільм.
15.40 Маст. фільм «Піраты XX стагоддзя».
17.10 «Аншлаг і Кампанія».
20.05 «Сумленны дэтэктыў».
20.40 Маст. фільм «Моцная слабая жанчына».
22.30 «Спецыяльны карэспандэнт».
23.35 Маст. фільм «Калі не хапае кахання».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

7.40 Мультфільм.
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.20 «Дзікі свет».
8.45 «Іх норавы».
9.25 «Ядзім дома!».
10.20 «Выратавальнікі».
10.50 «Асабліва небяспечны!».
11.30 «Першая кроў».
12.00 «Дачны адказ».
13.25 «У пошуках Францыі». «Зняць па-французску».
14.10 Меладрама «Па следу Фенікса».
16.25 Камедыя «Масквічы».
17.20 «І зноў прывітанне!».
18.20 «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
19.55 «Чыстасардэчнае прызнанне».
20.30 Серыял «Шэрыф».
0.05 «Авіятары».
0.35 «Футбольная ноч».

ТНТ

5.00 «Гэй, Арнольд!». М/с.
6.00 «Сапраўдныя монстры». М/с.
7.25 «Саша + Маша». Серыял.
7.50 «Інтуіцыя».
8.50 Латарэі: «Першая Нацыянальная» і «Фабрыка ўдачы».
9.00 «Школа рамонту».
10.00 «Бітва экстрасэнсаў».
11.00 «Камедзі Клаб».
12.00 «Пасля захаду сонца». Баявік.
14.00 «Інтэрны». Сітком.
16.00 «Брус Усемагутны». Камедыя.
17.50 «Наша Russia».
19.00 «Аляксандр». Драма.
22.15 «Дом-2».
23.45 «Забойная ліга».
1.00 «Смех без правілаў».
2.00 «Сэкс» з Анфісай Чэхавай.
2.35 «Гнеў жанчыны». Драма.
4.25 «Забойнай ночы».

КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00, 0.50, 1.50 Праграма перадач.
9.10 «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
9.40 «Алеся». Маст. фільм.
11.05, 0.00 «Легенды сусветнага кіно». Леанід Харытонаў.
11.35 «Набытак рэспублікі». Паварская вуліца.
11.50 «Вук». «Здзяйсненне жаданняў». М/ф.
13.30, 0.55 «Вялікія прыродныя з'явы». «Вялікая бяседа».
14.25 «Што рабіць?».
15.15 «Як немагчыма жылі мы...».
15.55 Опера Дж. Вердзі «Травіята».
18.30 «Развітанне». Маст. фільм.
20.40 Канцэрт Сціві Уандэра.
21.35 «Тайны цара Баспора». Дак. фільм.
22.20 «Бывай, паўднёвы горад». Маст. фільм.
0.25 «Дадатковыя магчымасці пятачка», «Блазан Балакіраў». М/ф для дарослых.

НАСТАЛЬГІЯ

6.00, 10.00, 15.00, 1.00 «Мінулы час».
6.50, 9.45, 14.45, 5.50 «Ералаш».
7.15, 3.15 «...да 16 і старэйшым». 16 мая 1991 года.
8.00, 4.00 Памяці Н. Гундарава: «Карчмарка». Тэлеспектакль. 1975 год.
9.15, 5.15 «Ранішняя пошта».
11.00, 2.00 «Народжаныя ў СССР».
12.15 «Да і пасля...». Год 1983.
13.55 «У гасцях у М. Магамаева. Фрэнк Сінатра». 1992 год.
15.45 «Чароўная сіла мастацтва». Маст. фільм.
17.15 «Аркестр Поля Марыа». Фільм-канцэрт. 1983 год.
17.45 «Прывітанне, май!». Канцэртная праграма. 1987 год.
19.45, 0.45 «Добрай ночы, малыя!».
20.00 «Быў час».
21.00 Праграма «А». 1989 год.
22.15 Дабрачынны канцэрт савецкіх музыкантаў. Май 1988 года.
23.00 «Вакол смеху». 1984 год.

НАША КІНО

6.30, 12.30 Драма «Аднойчы схлусіўшы...».
8.30, 14.30 Камедыя «Дрэсіроўшчыца тыграў».
10.30, 16.30 Меладрама «Турэмны раманс».
18.30, 0.30 Камедыя «Дуэнья».
20.30, 2.30 Меладрама «Дама з сабачкам».
22.30, 4.30 Дэтэктыў «Чужыя тут не ходзяць».

ДОМ КІНО

3.00, 11.00, 19.00 Серыял «Іншае жыццё».
3.50 Лірычная камедыя «Сваты-2».
5.50 Крымінальная драма «Справа Румянцава».
7.25 Меладрама «Безыменная зорка».
9.35 Ура, камедыя! «Самая абаяльная і прывабная».
11.50 Экранізацыя школьнай праграмы. «Дванаццаць крэслаў».
14.25 Меладрама «Нядзельны тата».
15.50 Лірычная камедыя «Дзеці панядзелка».
17.20 Новы хіт. Баявік «Егер».
19.55 Новы хіт. Крымінальная драма «Бумер. Фільм другі».
21.45 Лідар кінапракату. «Кур'ер».
23.10 Лідар кінапракату. «Вуліца поўная нечаканасцяў».
0.20 Крымінальная драма «Вяртанне да жыцця».

ТБ-21

9.00, 17.00, 1.00 Камедыя «Маці, бацькі, дзеці».
10.35, 18.35, 7.35 Камедыя «Ведаць бы, што я геній».
12.20, 20.20, 4.20 Камедыя «Няўдачлівыя».
13.50, 21.50, 5.50 Драма «Самарыцянка».
15.35, 23.35, 7.35 Драма «Мушэт».

ТБ1000

3.00, 21.00 Камедыя «Аргазм у Агаё».
5.00 Камедыя «Наступны прыпынак — Краіна цудаў».
7.00 М/ф «Птушыны спецназ».
9.00 Меладрама «Марні».
11.30 Камедыя «Дзіўныя сваякі».
13.00 Фільм жахаў «Птушкі».
15.00 Драма «Самы хуткі «Індзіян».
17.10 Меладрама «Прынцэса спецый».
19.00 Меладрама «Бессмяротнасць».
22.30 Драма «Рассякаючы хвалі».
1.30 Трылер «Унутры маёй памяці».

ТБ3

5.00 Д/ф «Зачараваны завяваль нік атаман Ярмак».
6.00 М/ф.
7.05 М/ф «Том і Джэры. Дзіцячыя гады».
7.30 М/ф «Юху і яго сябры».
8.00 М/ф «Адчайныя байцы Бакуган».
8.30 М/ф «Фостэр: дом для сяброў са свету фантазій».
9.00, 15.00 М/ф «Зорныя войны: Вайна клонаў».
10.00 Маст. фільм «Госця з будучыні».
12.30 Маст. фільм «Балбесы».
16.00 Маст. фільм «Ваенныя гульні».
18.15 Д/ф «Пасадка ў зоне 51».
19.15, 1.00 Маст. фільм «Слепая лютасць».
21.00 Маст. фільм «Ваенныя гульні-2: код смерці».
23.00 Маст. фільм «Чалавек-лічынка».
2.45 Маст. фільм «Чалавек-акула».
4.45 Д/ф «Міхаіл Ламаносаў. Магія генія».

РАМАНТЫКА

7.00, 18.40 «Марыя Роса».
7.55 «Прывітанне, красуня».
12.20, 17.50 «Смачнае захапленне».
13.20 «Рэванш-II».
19.35, 0.55 «Анучная лялька».
21.30 «Такое жыццё».
22.25 «Каханне пад наглядам».
0.00 «Браты дэтэктывы».
2.40 «Плата не па заслугах».

HALLMARK

1.00 Серыял «Аддзел мокрых спраў-II».
3.40 Маст. фільм «Пасля маёй смерці».
5.00 Серыял «Дочкі Макледа-VII».
6.40 Маст. фільм «Скарлет».
8.20 Маст. фільм «Місіс Вашынгтон едзе ў каледж Сміта».
10.00 Серыял «Зачараваныя-VII».
13.20 Маст. фільм «Святы Ральф».
15.00 Трылер «Клас 76».
16.40 Серыял «Шпік».
18.20 Камедыя «Лёгкае захапленне».
20.00 Серыял «Быць Эрыкай-II».
21.40 Маст. фільм «Прызнанні экзатычнай танцоўшчыцы».

SY FY

7.30, 0.20 Прытворшчык.
11.50 Баявік «У пагоні за ўраганам».
13.20 Цёмны анёл.
15.00, 22.40 У апошняе імгненне.
16.40 Па слядах прывідаў.
18.20 Пункт прызначэння — праўда.
20.00 Маст. фільм «Начны дазор».
22.00 Як здымаўся Начны дазор. Дак. фільм.

ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

5.00, 9.00, 13.00 Фільм-казка «Казка пра закаханага маляра».
6.20, 10.20, 14.20 М/с «Канікулы ў Прастаквашыне». Зборнік м/ф: «Жыў-быў сабака», «Самы вялікі сябар».
7.00, 11.00 М/ф «Ляўша». Казкі народаў свету. «Маленькі Шаго».
8.00, 12.00 Казкі Андэрсена. «Брыдкае качаня», Зборнік м/ф: «Тайна далёкага востраўа», «Аднойчы раніцай».
15.00 Меладрама «Калі я стану великанам».
16.25 М/с «Зіма ў Прастаквашыне». Казкі замежных пісьменнікаў. «Замак хлусоў».
17.00 М/ф «Смех і гора ля Белага мора «.
18.00 Казкі Андэрсена. «Русалачка». М/ф «Воўка ў Трыдзявятым царстве».

ЗДАРОЎЕ

5.00, 17.00 Не выходзячы з дому.
5.30, 17.30 Ты тое, што ты ясі.
6.00, 18.00 Выдаткі вытворчасці.
6.30, 18.30 Школу розуму.
7.00, 21.00 Я расту.
7.35, 21.35 Сакрэты здароўя.
8.00, 22.00 Практыка здароўя.
8.30 Панацэя.
9.00, 23.00 Набалелае пытанне.
9.40, 23.40 Кабінет прыгажосці.
10.10, 0.10 Невядомы дыягназ.
11.00, 1.00 Тайны медыцыны.
11.35, 1.35 Як Вы сябе адчуваеце?
12.05, 2.05 Як пражыць даўжэй.
13.00, 3.00 Цела чалавека.
13.30, 3.30 Жаночы часопіс.
14.05, 4.05 Няёмкія хваробы.
15.00 Хто старэе хутчэй?
15.30 Як памаладзець.
16.00 Я чакаю дзіця.
16.30 Гісторыя хваробаў.
19.00 Спытайце доктара.
19.30 Цела і кроў.
20.25 Памылкі здароўя.
22.30 Застацца ў жывых.

ТДК

6.00, 7.50, 10.50, 11.50, 13.00, 13.50, 14.50, 16.50, 17.50, 18.50, 22.00 Парады ТДК.
6.25, 3.00 Гісторыя поспеху.
7.25, 10.00, 17.00 Красуня.
7.50 Парады ТДК.
8.00 Добрай раніцы, Каханая!
9.00, 14.55, 22.30 Усё лепшае, для Вас.
11.00, 14.00, 2.00 Нашы дзеці.
12.00, 18.00, 22.10, 5.00 Ваш доктар.
13.25 Маю права.
15.55, 20.00 Ваш асабісты псіхолаг.
19.00 Люстэрка жыцця.
21.00 Сэксуальная рэвалюцыя.
23.00 Знакі лёсу.
4.00 Твой дом.

DISCOVERY

7.00, 4.45 Як гэта зроблена?
7.25 Як гэта працуе.
7.55, 15.15, 3.50 Лабараторыя выбуховых ідэй.
8.50, 14.20, 20.00, 2.55 Разбуральнікі легендаў.
9.45 «Маланкавыя катастрофы».
10.40 Рачныя монстры.
11.35 Раз'юшаная прырода.
12.30 Выжыць любой цаной.
16.10, 2.00 Скрыўленне часу.
16.35, 17.30 «Top Gear».
19.00 Круты цюнінг.
21.00 Смяротны ўлоў. Затор.
22.00 «Самыя небяспечныя гарады свету».
23.00 Выжыць у катастрофе.
0.00 Тайныя агенты.
1.00 Жанчыны-забойцы.
5.10 Крутыя выбухі.
6.05 Мегабудоўлі.

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 12.00 «Цуды інжынерыі».
6.00 «Разбойнікі селуса».
7.00 «Гіганцкія панды».
8.00 «Апошняя львіца».
9.00 «Армія львоў».
10.00 «Укусі мяне, або Падарожжа вірусолага».
11.00 «Супярэзбудаванні».
13.00 «На кручку».
15.00 «Ліхтугі за мяжой».
16.00 «У пошуках акул».
17.00 «Апакаліпсіс».
18.00 «Асабліва строгі рэжым».
19.00, 4.00 «Расследаванні авіякатастроф».
20.00, 23.00, 2.00 «Тайна горада блізнятаў».
21.00, 0.00, 3.00 «Расстрэльныя ўзводы фашыстаў».
22.00, 1.00 «З пункту гледжання навукі».

TRAVEL

7.00, 12.00, 16.00, 23.00 Суветны падарожнік.
8.00 Па чыгунках Швейцарыі.
10.00, 6.00 Сальерская чыгунка.
11.00, 21.00, 1.00 Беражыце дрэвы.
13.00 Планета ежы.
14.00 Шэф-кухар за мяжой.
15.00 Сакрэты старажытнага Кітая.
17.00 Сафары для бабуль.
17.30 Вясна.
18.00, 2.00 Далёкія берагі.
18.30, 2.30 Дзікія сэрцам.
19.00, 3.00 Раз'юшаная планета.
19.30, 3.30 Культурны шок.
20.00, 0.00, 4.00 Студыі Уолта Дыснея.
22.00 У канчатковым выніку.
5.00 Кароткая гісторыя завявання Аўстраліі.

ANIMAL PLANET

7.00 Вуліца лемураў.
7.25 Маёнтак сурыкатаў.
7.50 «Самыя забаўныя жывёлы планеты».
8.45, 5.20 Паліцыя Фенікса — аддзел па абароне жывёл.
9.40 «Ветэрынарная «хуткая дапамога».
10.05 Прыгоды Корвіна.
10.55 «Аддзел па ахове жывёл: паліцыя Маямі».
11.50 Осцін Сцівенс: самыя небяспечныя.
12.45 Тэрыторыя жывёл.
13.40 «Шатландскае таварыства абароны жывёл».
14.35 Сямейнае сафары.
15.30 Увядзенне ў сабаказнаўства.
16.25 Жыццё ў зграі.
17.20 Смутны час у гарадзе малпаў.
18.15 Як выжыць жывёлам?
19.10, 23.50 Востраў арангутангаў.
19.40, 0.15 Якія парадніліся з малпамі.
20.10, 0.45, 4.25 У пошуках гіганцкай анаконды.
21.05, 1.40 Дзікія і небяспечныя.
22.55, 3.30 Паліцыя Маямі — аддзел па абароне жывёл.
6.10 Таварыства па выратаванні жывёл.
6.35 Жакеі.

EUROSPORT

9.30, 19.30 Тэніс. Турнір WTA.
10.45 Аўтаспорт. Суперкубак Поршэ.
11.30, 15.00, 22.30 Веласпорт. Giro d'Italia.
12.00 Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно.
13.00, 18.30, 2.00 Супербайк. Чэмпіянат свету.
14.00 Суперспорт. Чэмпіянат свету.
19.15, 22.15 Мотаспорт па выхадных.
21.00 Бокс. Марка Хук (Германія) — Адам Рычард (ЗША).
23.30 Веласпорт. «Планета Армстронг».
0.00 Веласпорт. Тур Каліфорніі.

MTV

5.00, 0.05 Music.
6.00 Стэрэа_раніца. The Best.
8.40 Даступны экстрым.
9.10, 18.30 «Аватар».
10.00, 17.25 Губка Боб.
10.55 Наступны.
11.10, 20.15 Тачку на пракачку.
12.00 Уся праўда пра Heidi Klum.
12.55 Гарачыя хлопцы ля плиты.
13.20 Трэндзі.
13.50 News блок Weekly.
14.20 Ікона відэагульняў.
14.50 КінаЧарт.
15.20 Мой клон.
15.45, 20.40 Каралі танцпляцоўкі.
16.35 Праўда жыцця: Здаецца, я — алкаголік...
19.20 Ахвяры шоу-бізнэсу: Tupac Shakur.
19.45 Ахвяры шоу-бізнэсу: Notorious Big.
21.35 «Сэкс» з Тэкілай. Двайная спакуса.
22.25 «Паўднёвы парк».
23.30 Зорны бой насмерць.

ІНТЭР+

6.55 Маст. фільм «Ціхія берагі».
8.15 Украінская топ-дваццатка.
9.35 Школа доктара Камароўскага.
10.00 Украіна, уставай!
10.30 Тыдзень моды.
11.00 Маст. фільм «Без ашыйніка».
12.30 Маст. фільм «Двое пад адным парасонам».
13.55 Маст. фільм «Капеж».
15.25 Маст. фільм «Правінцыйны анекдот».
16.00 Вячэрні квартал.
17.35, 0.35 Бум.
18.35, 1.40 Месца сустрэчы. Чуткі, плёткі.
20.00, 3.00 Падрабязнасці тыдня.
20.45, 3.45 Маст. фільм «Адзіноката жанчына жадае пазнаёміцца».
22.15, 5.15 Маст. фільм «Туманнасць Андрамеды».
23.40 Самаабарона.
0.05 Парк аўтамабільнага перыяду.
6.30 Феерыя падарожжаў.

17.10 ФІЛЬМ ДНЯ

«ВАЛЕРЫЙ ХАРЛАМАЎ. ДАДАТКОВЫ ЧАС» (Расія, 2008 г.)

Гісторыя жыцця выдатнага савецкага хакеіста Валерыя Харламава, які трагічна загінуў у аўтамабільнай катастрофе ва ўзросце 33 гадоў. Харламаў двойчы быў Алімпійскім чэмпіёнам, восем разоў — чэмпіёнам свету.

Рэжысёр — Юрый Каралёў. **У ролях:** Аляксей Чадаў, Дзмітрый Харацьян, Вольга Красько.



ЭКСКУРСІЯ «З ПАГРУЖЭННЕМ» ПА ГАРАДАХ-ГЕРОЯХ

Тэлесеткі

Да 65-й гадавіны Вялікай Перамогі практычна кожны тэлеканал пастараўся падрыхтаваць для сваіх гледачоў што-небудзь асаблівае, эксклюзіўнае. Не стаў выключэннем і канал АНТ, прымеркаваўшы да гэтай святочнай даты прэм'еру 13-серыйнага дакументальна-мастацкага праекта «Гарады-героі». Аснову кожнай серыі склалі падрабязныя ўспаміны пра першыя дні абароны гарадоў, якія потым атрымалі ганаровае званне герояў — Брэста, Кіева, Мінска, Санкт-Пецярбурга (Ленінграда), Адэсы, Валгаграда (Сталінграда), Масквы, Новарасійска, Керчы, Тулы, Смаленска, Мурманска... Прычым здымачная група не задаволілася толькі архіўнымі матэрыяламі, а пабывала ў кожным з названых гарадоў, адшукала відавочцаў падзей, гісторыкаў, сваякоў загінулых герояў, зазірнула ў месцы, дзе яшчэ захоўваецца пах вайны...

Фота тэлеканала АНТ

— Гэта вельмі важны для нас праект, бо закранутая сапраўды святая тэма, — адзначае генеральны прадзюсар праекта Аляксандр Рыдван. — Праца пачалася яшчэ ў верасні мінулага года і доўжыцца дагэтуль. Мы абралі незвычайны жанр: дакументальна-мастацкае кіно з прымяненнем складанай камп'ютарнай графікі і крэатыўнага мантажу. Такое спалучэнне разам з выдатнай ігрой акцёраў Ігара Сігова і Уладзіміра Гасцюхіна дазволіць гледачам у поўнай меры адчуць атмасферу ваеннага часу.

Дарэчы, для мастацкіх элементаў — пастановачных эпізодаў, з дапамогай якіх стваральнікі якраз імкнуліся перадаць дух вайны — былі задзейнічаны больш як 300 прафесійных акцёраў, якім давялося здымацца ў сапраўды экстрэмальных умовах — у паветры і ў вадзе, пад зямлёй і ў снезе, у маразы, ад якіх імгненна нямелі рукі. Але найбольшыя выпрабаванні выпалі на долю Ігара Сігова, якому дасталася роля выпрабавальніка — акцёр на ўласным досведзе праверыў, як гэта — збірацьі разбіраць аўтамат, паўзці па-пластунску і плыць у вадзе пад абстрэлам, падпальваць «стратэгічныя аб'екты» і акопвацца, высветліў, пры якой тэмпературы плавіліся цагліны Брэсцкай крэпасці і як правільна збіраўся супрацьтанкавы «вожык»...

— Ігар, а якія выпрабаванні далося вам цяжэй за ўсё, да чаго зусім не былі гатовыя?

— Да халадоў, — шчыра прызнаецца акцёр. — Спадзяваўся, што здымкі пачнуцца ў больш-менш цёплае надвор'е, але большая іх частка выпала на такія маразы, што страшна ўзгадаць... Аднак працаваць, спалучаючы амплуа вядучага і акцёрскае, было ўсё ж вельмі цікава, мне нават самому хочацца паглядзець гатовыя серыі, што ў нас атрымалася. За сябе магу сказаць, што стаў лепш разбірацца ў зброі — што такое карабін, а што такое «лінейка», больш падрабязна разумею, чым адрозніваюцца паміж сабой вінтоўкі — наша, нямецкая, японская...

— Адкуль вашы асабістыя веды пра вайну — з расказаў сваякоў, з кніг, фільмаў? Працуючы ў праекце, для сябе вы адкрылі штосьці новае?

— Так, пра вайну мне расказвалі бабулі і дзядулі, пэўныя веды пачарпнуў з нашых савецкіх фільмаў... Але падчас здымак праекта «Гарады-героі» сапраўды дазнаўся пра невядомыя раней факты — напрыклад, што многія гарады здаваліся фактычна без бою, а іншыя, наадварот, нават калі нам па радыё казалі «Керч пала», працягвалі змагацца з захопнікамі, і цягам яшчэ некалькіх месяцаў горад не здаваўся, там быў партызанскі рух, падпольнае супраціўленне.

Уладзімір Гасцюхін, які, са свайго боку, выступіў у ролі вядучага-апавядальніка, сцвярджае, што праект атрымаўся годным і цікавым.

Першая серыя праекта «Гарады-героі», прысвечаная Брэсцкай крэпасці, будзе паказаная ў эфіры АНТ 8 мая, другая — пра горад-герой Кіеў — у Дзень Перамогі, 9 мая.

Да святочнага эфіру 9 мая АНТ падрыхтавала таксама музычны фільм дакументальнага цыклу «Песні Перамогі. Ключ да сэрца кожнага». Нямногія ведаюць, што песня «Дзень Перамогі», такая папулярная дагэтуль, спачатку гучала зусім па-іншаму, і да поспеху ішла нялёгкім шляхам. Цяпер гледачы ўпершыню даведаюцца пра тое, хто быў заказчыкам гэтай песні, якую «памылку» дапусціў паэт Уладзімір Харытонаў і за што даставалася Давіду Тухманаву ад Саюза кампазітараў, а галоўнае — каму насамрэч песня абавязаная сваім поспехам...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Інтымная прапанова

СЭКСУАЛЬНАЕ ЗДАРОЎЕ БЕЛАРУСАЎ. МІФЫ І РЭАЛЬНАСЦЬ

У 1974 годзе першы прафесійны сэксапатолаг Беларусі, ініцыятар стварэння і нязменны кіраўнік Беларускай сэксалагічнай асацыяцыі Дзмітрый КАПУСЦІН прыняў свайго першага кліента, які звярнуўся з праблемай сэксуальнага расстройства. У гэтым інтэрв'ю Дзмітрый Зіноўевіч расказвае пра асноўныя сэксуальныя расстройствы і прычыны іх узнікнення.

— Колькі беларусаў пакутуе ад сэксуальных расстройстваў?

— Паводле сусветнай статыстыкі, кожны 10-ы мужчына пакутуе ад сэксуальных парушэнняў. Напрыклад, на эрэктыльную дысфункцыю ў ЗША скардзяцца ад 10 да 30 мільёнаў мужчын. Гэта прыкладна 10 працэнтаў мужчынскага насельніцтва. У Даніі гэта 4 працэнты мужчынскага насельніцтва, у Вялікабрытаніі — да 7 працэнтаў. Калі браць за аснову сусветную статыстыку, то ў Беларусі ад сэксуальных расстройстваў пакутуюць прыкладна 200 тысяч чалавек. Да спецыялістаў жа з падобнымі праблемамі звяртаецца не больш за 4 тысячы чалавек штогод. З гэтай колькасці мужчыны складаюць 95 працэнтаў. Жанчына можа жыць палавым жыццём нават пры наяўнасці сэксуальных расстройстваў. Усё залежыць ад таго, навошта ёй сэкс — усяго ў жанчын каля 40 матывацый да палавога жыцця. Як правіла, часцей жанчыны са сваімі сэксуальнымі праблемамі звяртаюцца да псіхолагаў. Яшчэ адзін распаўсюджаны «жаночы» варыянт выхаду з праблемы — самастымуляцыя (мастурбацыя). Даволі шмат і такіх жанчын, якія зусім нічога не робяць у надзеі, што іх сэксуальнасць разаўецца з узростам або са з'яўленнем новага партнёра.

— Чым вы тлумачыце прычыны нізкай колькасці зваротаў да ўрачоў-сэксолагаў?

— Іх вельмі шмат. Напрыклад, мужчыны баяцца магчымай агалоскі, саромеюцца самога факта звароту, часта не ўпэўненыя ў поспеху лячэння, апасаюцца, што лячэнне ўдарыць па кішэні. Адны не давяраюць дзяржаўнай сістэме аховы здароўя або ўрачам у прынцыпе, іншыя апасаюцца, што пры сэксалагічным абследаванні выявіцца больш сур'ёзнае захворванне. А нехта пастаянна адкладвае наведванне спецыяліста на пасля, цешыць сябе надзеямі, што ўсё пройдзе само сабой, або проста ставяцца з абыякавасцю да сваёй партнёркі. Ёсць і такія, хто спадзяецца на разрэкламаваныя ў СМІ «цудадзейныя» прэпараты або думаюць, што пры магчымай змене сэксуальнай партнёркі патэнцыя адновіцца.

У жанчын таксама ёсць шэраг прычын. Многія, напрыклад, мяркуюць, што сам факт звароту можа прынізіць або пакрыўдзіць мужчынскі гонар партнёра або проста саромеюцца расказаць урачу пра свае сэксуальныя праблемы. Некаторыя жанчыны замоўчваюць сітуацыю, каб не праслыць німфаманкамі. Нехта лічыць такія кансультацыі бессэнсоўнымі па прычыне абыякавага стаўлення мужа да палавога жыцця або да асобы самой жанчыны.

У надзеі вылечыцца ад палавой слабасці шэраг пацыентаў звяртаюцца да тых спецыялістаў, якія, па іх меркаванні, «бліжэй да мужчынскіх праблем» — да ўрачоў-уролагаў. І сапраўды, часам лячэнне выяўленай уралагічнай паталогіі прыводзіць да аднаўлення патэнцыі. Але ў палавым акце бярэ ўдзел не толькі палавы член і прастата, але і эндакрынная, нервовая сістэмы і, галоўнае — псіхіка, якой наносіцца ўдар нават пасля адзінкавага сэксуальнага зрыву. Бо ў такім выпадку з'яўляецца страх магчымай няўдачы, які ў сваю чаргу можа выклікаць працяглую адмову ад палавога жыцця.

У ЗША практыкуецца сэкс-тэрапія — метад лячэння сэксуальных парушэнняў і сэксуальных дысгармоній, распрацаваны сэксолагамі Мастэрсам і Джонсанам. Сэкс-тэрапеўт працуе не з двума, а з трыма партнёрамі — мужчынам, жанчынай і іх шлюбам. Такі падыход у лячэнні сэксуальнага расстройства мае на ўвазе змяненне узаемаадносінаў партнёраў, а таксама іх асабістага стаўлення да праблемаў сэксу ў прынцыпе. У нас жа партнёры ў пары прыходзяць надзвычай рэдка. Прычыны часта хаваюцца ў матывацыі да сэксу. Напрыклад, многія жанчыны проста не хочуць лішні раз акцэнтаваць увагу на «трэшчыне» ў сэксуальным жыцці, таму што муж — здабытчык, ён зарабляе грошы, забяспечвае сям'ю. Навошта ж секчы сук, на якім сядзіш? Прасцей імітаваць аргазм або знайсці палюбоўніка.

— Чым выкліканы асноўныя сэксуальныя дысфункцыі мужчыны?

— Зніжэнне або адсутнасць палавога жадання можа быць выклікана многімі прычынамі — ад злоўжывання транквілізатараў, гіпатэнзіўных прэпаратаў да пячонкавай, ныркавай ці дыхальнай недастатковасці. Такое адхіленне, як сэксуальная агіда можа быць вынікам няправільнага сэксуальнага выхавання дзіцяці, непрымальнымі, з пункту гледжання мужчыны, патрабаваннямі партнёркі да сэксуальных кантактаў, а таксама страта партнёркай эратычнай прывабнасці для мужчыны.

— Што выклікае сэксуальнае расстройства, у прыватнасці, эрэктыльную дысфункцыю ў мужчын? І якім захворваннем можа спрыяць сэксуальная паталогія?

— У многіх мужчын эрэктыльная дысфункцыя можа быць выклікана або ўзмоцнена дэпрэсіяй, нізкай самаацэнкай, пачуццём трывогі, напружанасці і страху. З-за боязі аказацца няздольным у сэксуальных абставінах многія мужчыны адмаўляюцца ад спроб блізкасці, што, з аднаго боку, выклікае нарастанне напружанасці ў адносінах з партнёркай і часам нават правакуе разрыў адносінаў. З іншага боку, сэксуальнае ўстрыманне (па любой прычыне) і асабліва пасля 40—45 гадоў, можа прывесці да сэксуальнага фіяска п

КАМІСАР ФЁДАРАЎ І ІНШЫЯ

У першыя ж дні Вялікай Айчыннай вайны на Беларусі ўзніклі невялікія групкі і атрады народных мсціўцаў, якія паступова выраслі ў буйныя магутныя і баяздольныя брыгады. Мне хочацца распавесці некалькі цікавых эпізодаў з дзейнасці знакамітай на Міншчыне партызанскай брыгады «Штурмавая», камісарам якой стаў былы палітрук Ілья Мартынавіч Фёдараў.

...Батарэя, дзе служыў намеснік камандзіра па палітычнай частцы Ілья Фёдараў, пасля першага тыдня жорсткіх баёў трапіла ў акружэнне непадалёк ад Ліды. З варожага кола спачатку прабіваліся разам, а пасля раздзяліліся на невялікія групы: так лягчэй было прабірацца незаўважанымі. З Фёдаравым засталося восем чырвонаармейцаў. На 12-ы дзень небяспечнай і цяжкай дарогі па акупаванай ворагам тэрыторыі група падышла да ракі Бярэзіна. Ні моста, ні броду адшукаць не ўдалося. Вырашылі перапраўляцца з дапамогай падручных сродкаў. Фашысты засеклі пераправу і адкрылі ўраганны агонь з аўтаматаў, кулямётаў і мінамётаў.

Фёдарава параніла і 13 ліпеня горкага 1941-га нампаліт аказаўся ў палоне. Шматлікія допыты, катаванні... Ад смерці выратавала чырвонаармейскае абмундзіраванне, якое падчас акружэння апрануў Ілья Мартынавіч. Таму яго не расстралялі, як рабілі гэта з усімі палітработнікамі, а паверылі ў тое, што ён радавы салдат і адправілі ў лагер ваеннапалонных у Масюкоўшчыне. Думкі пра ўцёкі прыйшлі адразу ж, але параненая нага, жорсткія ўмовы аховы лагера рабілі гэта пакуль немагчымым. Толькі ў сакавіку 1942 года ўдалося здзейсніць задуманае: група былых ваеннапалонных стала баявым ядром партызанскага атрада «Штурм», які потым з цягам часу вырас у грозную баяздольную брыгаду спецыяльнага прызначэння, што наводзіла жах на акупантаў. Камісарам яе быў прызначаны І.М. Фёдараў.

Дзякуючы сваім высокім чалавечым якасцям, прыроднай мудрасці, ён стаў душой выхаваўчай работы ў брыгадзе «Штурмавая». Да яго цягнуліся людзі, і камісар разумеў іх нават нявыказаныя, няпэўныя імкненні, стараўся дапамагчы і парадай, і справай. І таму нядзіўна, што Ілья Мартынавіч быў адной з найвышэйшых інстанцый, да якой звярталіся байцы, — і па параду, і па канчатковае рашэнне. Асабліва ярка праявіліся выхаваўчыя здольнасці І.М. Фёдарава ў рабоце, у гутарках з замежнымі грамадзянамі, якія дэзерціравалі з гітлераўскай арміі і перайшлі на бок партызан. Пасля яны геранічна змагаліся ў радах народных мсціўцаў супраць фашызму.

Пра іх з цеплынёй успамінаў Ілья Мартынавіч. Наогул, цеплыня гэтая была ўзаемнай: былыя партызаны-замежнікі з нязменнай павагай ставіліся да свайго брыгаднага камісара. Першым перабежчыкам у брыгаду «Штурмавая» быў

РЫМАЛЬД дэ ЮНГ, ГАЛАНДЗЕЦ

Ён служыў асабістым шафёрам каменданта горада Маладзечна. Падпалкоўнік, якога вазіў дэ Юнг, вызначаўся крутым норавам. Перакананы нацыял-сацыяліст, фашыст з галавы да ног, ён пагардліва ставіўся не толькі да мясцовага насельніцтва, але і да сваіх падначаленых, усяляк выслужваўся перад гаўляйтарам Кубэ. Аднойчы за нейкую нязначную правіннасць ён загадаў жорстка пакараць свайго конюха: таго ў 30-градусны мароз раздзелі дагала і аблівалі вадой да таго часу, пакуль ён не ператварыўся ў ледзяную статую.

У хвіліны добрага настрою камендант дазваляў сабе загаварыць са сваім шафёрам. Рымальд дэ Юнг у час такіх маналогаў даведаўся ад шэфа, што непадалёк ад Мінска дзейнічае буйная «банда» (так камендант называў партызанскае злучэнне) і што Кубэ загадаў знішчыць яе. Рымальд вырашыў папярэдзіць партызан. Тым больш што думка перайсці на бок гераічнага няскаранага народа выспявала даўно, а пакаранне конюха, сведкам якога ён стаў, з'явілася своеасаблівым каталізатарам, апошнім штуршком да гэтага. Зручны выпадак хутка надарыўся: падчас чарговай паездкі каменданта на даклад гаўляйтару Рымальд, выкарыстаўшы вольны час, адправіўся на пошукі партызан. У вёсцы Жукаўка ён сустрэў партызанскіх разведчыкаў Гарачава і Арлова. Яны і даставілі яго ў штаб.

Фёдараў неаднаразова і падоўгу гутарыў з перабежчыкам, які пераконваў камісара, што ў сябе на радзіме ён быў камуністам, настойліва прасіў залічыць яго ў баявы строй. Нешта ў гэтым энергічным чалавеку падкупляла, схіляла да веры ў яго шчырасць. Ілья Мартынавіч вырашыў выпрабаваць Рымальда і даў яму цяжкае заданне, з якім той бліскуча справіўся. Так у атрадзе «Штурм» з'явіўся новы баец-партызан. Ілья Мартынавіч не памыліўся: ваяваў Рымальд дэ Юнг (яго называлі коратка Рым) мужна, стаў выдатным кулямётчыкам, разведчыкам, падрыўніком. На жаль, падчас апошняй блакады ў чэрвені 1944 года галандзец дэ Юнг загінуў, прыкрываючы з кулямётам адыход сваіх баявых таварышаў.

РАЗВЕДЧЫК ЭРНСТ ЭДМУНД, ПАЛЯК

Амаль у той жа час, калі ў атрадзе «Штурм» пачаў баявую біяграфію галандзец дэ Юнг, а менавіта ў канцы жніўня 1942 года, у партызанскія шэрагі ўліўся шаснаццацігадовы паляк Эрнст і яго паплечнікі — літовец Франц Станкявічус, украінец Паўло Недаступа. Эрнста сілком мабілізавалі і прывезлі адбываць працоўную павіннасць у Гданьск на чыгуначна-рамонтны завод. Там Эрнст пазнаёміўся з Недаступам і Станкявічусам. Абодва былі камсамольцамі. Яны і падгаварылі Эдмунда ўцячы з рабочага лагера. Эрнст нядрэнна валодаў рускай і нямецкай мовамі, быў перакладчыкам. Раздабыўшы бланкі камандзіровачных пасведчанняў, ён падрабіў дакументы на паездку ў Вільнюс, і на цягніку сябры дабраліся да літоўскай сталіцы.

Але тут іх чакала няўдача: устанавіць сувязі з падполлем Станкявічусу не ўдалося. Тады падманам атрымаўшы ў камендатуры мясцовай чыгуначнай станцыі неабходныя дакументы, яны адправіліся на Мінск. У Маладзечне, апасаючыся праверкі, сябры выйшлі з вагона і пешшу рушылі на ўсход, у партызанскую зону. У вёсцы Курневічы іх затрымалі разведчыкі атрада «Штурм» Павел Цімохін і Мікалай Рашэўскі. Палонных яны прывялі ў штаб атрада, у вёску Манылы. І першая гутарка ў навічкоў адбылася з камісарам Фёдаравым.

Дакладна праверыць звесткі з расказаў сураможцаў было немагчыма, таму зноў на дапамогу прыйшла інтуіцыя, уменне разбірацца ў людзях, разумець іх. Гэтыя якасці падказалі камісару, што хлопцы не ворагі і шчыра імкнуцца ваяваць з фашыстамі. Да вызвалення Беларусі яны плячо ў плячо змагаліся ў брыгадзе «Штурмавая».

Пасля Эрнст Эдмунд мужна ваяваў у польскім войску, у складзе разведгруп Чырвонай Арміі неаднаразова дэсантаваўся ў варожы тыл, спачатку на тэрыторыю акупаванай Польшчы, а пасля — Германіі, узорна выконваў баявыя задачы. Ён узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» I ступені, вышэйшай воінскай узнагародай ПНР сярэбраным крыжам «Вірытуці мілітары», шматлікімі медалямі. У пасляваенныя гады Эдмунд неаднаразова прыязджаў на традыцыйныя штогадовыя партызанскія сустрэчы на месца дыслакацыі штаба брыгады «Штурмавая». Прыязджаў сюды і

АЛЬФРЭД ЦЫНХОБЕЛЬ, АЎСТРЫЕЦ

На ўсходні фронт Альфрэд Цынхобель, аўстрыйскі сацыял-дэмакрат, трапіў у 1943 годзе пасля татальнай мабілізацыі. Праўда, у дзейную армію іх, нядобранадзейных, паспаць не рашыліся, каб яны не перайшлі на бок Чырвонай Арміі. Іх накіравалі на барацьбу з партызанамі: загіне адзін-другі палітычны ад партызанскай кулі — страта для рэйха невялікая, на фронце ж патрэбныя надзейныя салдаты.

Цынхобель аказаўся ў карным батальёне ў Лагойску. Тут у яго ўзнікла думка пакінуць рады вермахта. Ён знайшоў і аднадумцаў — камандзіра аддзялення Заўэра і радавога Цынканда. Зручны момант надарыўся, калі аддзяленне адправілі вартаваць мост непадалёк ад Плешчаніцаў. Па дарозе да аб'екта па папярэдняй дамове аднадумцаў Заўэр скамандаваў:

— Хто згодны са мной ісці ў партызаны, тры крокі наперад!

Альфрэд і Цынканд адскочылі ўбок, астатнія схапіліся за зброю. Але трое змоўшчыкаў апярэдзілі іх: фашысты засталіся нерухома ляжаць на дарозе. Альфрэд Цыхобель і яго таварышы ў верасні 1943 года сталі байцамі партызанскага атрада імя Панамарэнкі брыгады «Штурмавая». Пасля вайны Альфрэд таксама прыязджаў на партызанскія сустрэчы.

Юліян ВЫСОЦКІ,
член Беларускага саюза журналістаў.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

Номер лота	1	2	3	4	5
Наименование объекта	Право аренды земельного участка				
Местонахождение объекта	Гродненская область, Дятловский район, г.п. Новоельня, ул. Октябрьская, д. 1	Гродненская область, Дятловский район, г.п. Новоельня, ул. Ленина, д. 26 Б	Гродненская область, Дятловский район, г.п. Новоельня, ул. Ленина, д. 26 а	Гродненская область, Дятловский район, д. Вензовец, ул. Новая, д. 1д	Гродненская область, г. Дятлово, ул. Советская, д. 14 а
Кадастровый номер	422356300002000348	422356300002000564	422356300002000607	422380300602000091	422350100002001000
Площадь участка (га)	0,0050	0,0050	0,0030	0,0099	0,0072
Форма проводимого аукциона	Аукцион без условий				
Срок аренды	Аренда 5 лет			Аренда 10 лет	Аренда 30 лет
Условия продажи	Установка торгового павильона				Строительство магазина
Возмещение потерь сельскохозяйственного производства (руб.)	–	–	–	–	164500
Начальная цена (руб.)	99878	80240	47627	2804	553780
Сумма задатка (руб.)	10000	8100	4800	300	55400
Расходы, связанные с организацией, проведением аукциона и подготовкой документации (руб.)	590671 (кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ)	600621 (кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ)	84000 (кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ)	732507 (кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ)	632271 (кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ)

Лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка;

заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3602515007741 в филиале № 416 АСБ «Беларусбанк», г. Новогрудок, ЦБУ 407, код 698, УНП 500049290, код платежа: 1) по продаже права аренды земельного участка – 4002; получатель платежа – финансовый отдел Дятловского райисполкома.

Гражданин – копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (паспорт).

Индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования.

Представитель гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность.

Юридическое лицо – представителям или уполномоченному должностному лицу юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о гос. регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь (принимает участие в аукционе только на право аренды земельного участка) – представителю или уполномоченному должностному лицу иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

Представитель иностранного гражданина (принимает участие в аукционе только на право аренды земельного участка) – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Платеж за объект осуществляется единовременно по безналичному расчету в расчетных билетах Национального банка Республики Беларусь.

В случае победы расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона, возмещает покупатель объекта.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами.

Аукцион состоится 11 июня 2010 года в 11.00 по адресу: г. Дятлово, ул. Красноармейская, 3 в зале заседаний.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Дятлово, ул. Ленина,18, каб. 9 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Телефоны для справок в г. Дятлово: 8 01563 21778, 21610.

Заявления принимаются по 8 июня 2010 года до 17.00 включительно.

САЛЮТ АРКЕСТРАЎ

Урачыстага суквецця ў небе прапануюць чакаць пад суквецце гукаў на зямлі

9 мая ля абеліска «Мінск — горад-герой» тыя, хто захоча панаслухаць за святочным салютам, могуць стаць сведкамі своеасаблівага культурнага выбуху: тры вялікія сімфанічныя аркестры аб'яднаюцца ў адзін надзвычай вялікі.

Такое ўжо было, калі аб'ядноўваліся ў адным канцэрце Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі, Сімфанічны аркестр Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра і аркестр Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі. Але толькі з нагоды святаў выступаў такі вялікі калектыў — 250 музыкантаў у ім. І ў залах.

Маштабны музычны фронт на гэты раз разгорнецца, можна сказаць, у экстрэмальных умовах — на адкрытым паветры будзе спецыяльна ўсталяваная сцэна. Галоўнакамандуючым (дырыжорам), які будзе кіраваць зводным калектывам, стане Аляксандр Анісімаў. Перамога — гэта свята, якое аб'ядноўвае. Таму ў праграме «Сімфонія Перамогі» выступяць яшчэ і аркестр «Няміга» і нават аркестр Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь.

І ўсё задумана дзеля таго, каб чакаць салюту пад гукі, якія ўвасабляюць велічнасць чалавечага духу: ад «Вясны» з «Часоў года» Вівальдзі да твораў Шастаковіча, Свірыдава, Хачатурана, а яшчэ далучыцца беларускі музычны фронт з музыкай Агінскага, Глебава, Смольскага, Картэса. Усе, хто гэта пачуе, проста абавязаныя будуць адчуць перамогу высокага ў сваіх душах. «Сімфонія Перамогі» пачнецца а 21-й гадзіне. Самы час для шпацыру.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Былая партызанка, ветэран прадпрыемства Елізавета ГЛАЗКОВА.

5 мая ў Гомелі на тэрыторыі СП «Спартак» адкрыта мемарыяльная дошка ў памяць работнікаў кандытарскай фабрыкі, якія ваявалі ў гады Вялікай Айчыннай вайны на фронце і ў партызанскіх атрадах. На мемарыяле, які прадпрыемства ўзвяло за кошт сваіх сродкаў, высечана 45 прозвішчаў воінаў.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ С УСЛОВИЯМИ НА ПРАВО ПРОЕКТИРОВАНИЯ И СТРОИТЕЛЬСТВА КАПИТАЛЬНЫХ СТРОЕНИЙ (ЗДАНИЙ, СООРУЖЕНИЙ) В г. БРЕСТЕ

Предмет аукциона	Право на заключение договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий и сооружений) на земельном участке					
	лот № 1	лот № 2	лот № 3	лот № 4	лот № 5	лот № 6
	ул. Ленина, 42 площадью 0,0537 га	ул. Гоголя, 42, 42/1, 44 и 46/1 площадью 0,2950 га	ул. Комсомольская, 5, 7, 7/1 и 9 площадью 0,2416 га	территория бывшего в/г № 2 «Южный» площадью 8,8797 га	ул. Коммунистическая, 20 площадью 0,2580 га	ул. К. Маркса, 95 площадью 0,0460 га
Функциональное назначение земельного участка	строительство и обслуживание административно-офисного здания с объектами торговли и соцкультбыта на 1 этаже	строительство жилых домов с объектами соцкультбыта на 1 этаже	строительство жилого дома с объектами соцкультбыта на 1 этаже	строительство многоэтажных жилых домов повышенной комфортности	строительство и обслуживание объекта административно-офисного назначения	строительство и обслуживание объекта административно-торгового назначения
Срок аренды зем. участка	5 лет	5 лет	5 лет	5 лет	5 лет	5 лет
Объекты недвижимости, подлежащие сносу	- встроенные нежилые помещения КУП «ЖРЭУ г. Бреста» по ул. Ленина, 42; - встроенные жилые помещения, находящиеся в собственности граждан	- здания и сооружения КУП «ЖРЭУ г. Бреста» по ул. Гоголя, 42, 42/1 и 46/1; - встроенные жилые помещения, находящиеся в собственности граждан	- здания и сооружения КУП «ЖРЭУ г. Бреста» по ул. Комсомольская, 5, 7 и 9; - встроенные жилые помещения, находящиеся в собственности граждан	- здания и сооружения КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»	- здания и сооружения КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» по ул. Коммунистической, 20; - сооружения по ул. Ленина	- здания и сооружения КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» по ул. К. Маркса, 95
Снос объектов недвижимости производится в установленном законодательством порядке. Объекты расположены в районах с развитой инженерной инфраструктурой.						
Наличие инженерных коммуникаций на зем. участках	централизованные водоснабжение, водоотведение, теплоснабжение и газоснабжение, электросети			электросети	централизованные водоснабжение, водоотведение, теплоснабжение и газоснабжение, электросети	
Начальная цена продажи (руб.)	17 261 186	74 301 958	55 590 033	1 483 104 521	85 842 521	15 217 969
Сумма задатка (руб.)	1 726 000	7 430 000	5 559 000	148 310 000	8 580 000	1 520 000
Расх. по подг. земел.-кадастр. документации, тех. условий, АПЗ (руб.)	3 209 628	5 890 116	5 890 116	4 591 398	5 236 639	3 479 946
Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельных участков и сносом расположенных на них объектов недвижимости, возмещаемый победителем аукциона землепользователям						
Восстановительная (остаточная) стоимость нежилых объектов недвижимости, руб.	43 489 485	5 021 967	65 959 082	3 522 682 742	–	–
Рыночная стоимость нежилых объектов недвижимости, руб.	–	–	–	–	127 891 787	382 419 000
Рыночная стоимость жилых объектов недвижимости, рублей/площадь	459 661 000 / 187,9 кв.м	681 064 000 / 277,6 кв.м	916 940 000 / 377,5 кв.м	–	–	–
Площади жилых помещений для возврата в гос. жил. фонд	–	382,3 – 497,3 кв.м	132,2 – 167,2 кв.м	–	–	–

Победитель аукциона обязан:

приступить к освоению земельного участка в течение 6 месяцев с даты заключения договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий и сооружений);

передать в коммунальную собственность г. Бреста для отселения граждан, жилые помещения типовых потребительских качеств, в соответствии с пунктами 44-46 Положения о порядке учета граждан, нуждающихся в улучшении жилищных условий, предоставления жилых помещений государственного жилищного фонда, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 29 ноября 2005 г. № 565 «О некоторых мерах по регулированию жилищных отношений» на условиях ранее заключенных договоров найма жилых помещений;

предоставить взамен жилых помещений, находящихся в собственности граждан жилые помещения, равноценные по благоустройству, по общей площади не менее ранее занимаемых, расположенные на территории города, либо по желанию граждан выплатить денежную компенсацию за принадлежащие им на праве собственности жилые и нежилые помещения.

Дополнительным условием для победителя торгов:

по лоту № 4 – разработка проекта застройки квартала № 2 в р-не Южного городка на зем. участке S=26.11 га в течение нормативных сроков, предусмотренных законодательством, с даты заключения договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в г. Бресте;

по лоту № 5 – разработка и согласование в установленном законодательством порядке генерального плана объекта строительства с проектируемыми инженерными сетями в течение 2-х месяцев с даты проведения аукционных торгов; здания и сооружения по ул. Коммунистической, 20 находятся в безвозмездном пользовании в Управлении Департамента исполнения наказаний МВД РБ по Брестской области до 31.01.2012 г. согласно договору от 01.02.2009 г. № 3-Б;

по лоту № 6 здания и сооружения по ул. К. Маркса, 95 находятся в безвозмездном пользовании в УВД Брестского облисполкома до 30.01.2012 г. согласно договору от 01.02.2009 г. № 2-Б.

Организатор торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью».

Перечень документов, представляемый потенциальным участником аукциона: заявление на участие в аукционе; заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; **юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем** – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; **иностранным юридическим лицом** – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; **представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель)** – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Задаток в размере до 10 % от начальной цены объекта перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012000002678 в филиале № 126 АСБ «Беларусбанк» г. Бреста, код 252, УНП 290433924. Лицо, желающее участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, на которых находятся объекты недвижимости, подлежащие сносу, вносит задаток в размере, установленном для объекта с наибольшей начальной ценой.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукциона с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. В аукционе могут участвовать юридические лица и индивидуальные предприниматели. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

Победитель аукциона обязан: ● в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения горисполкома о предоставлении ему земельного участка осуществить оплату за аукционный объект и возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации, тех.условий и АПЗ; ● заключить с Брестским горисполкомом договор аренды земельного участка и договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) после выполнения условий, связанных с изъятием земельного участка, в установленные законодательством сроки; ● приступить к освоению земельного участка в течение 6 месяцев с даты заключения договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений); ● по истечении срока аренды земельного участка, совместно с Брестским горисполкомом, в установленном порядке решить вопрос его дальнейшего использования. Оплата за объект может быть произведена в рассрочку в соответствии с порядком, утвержденным решением горисполкома. **Победитель аукциона обязан** в течение 10 рабочих дней с даты проведения торгов возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.

Аукцион состоится 11 июня 2010 г. по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 605. Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 07.05.2010 г. до 17.30 07.06.2010 г. по адресу: г. Брест, ул. Комсомольская, 46. Контактные телефоны: 23 81 92, 23 45 56, 23 43 48. Сайт: bgcn.by, city.brest.by.

Прамая лінія

АЛЕРГІЧНУЮ РЭАКЦЫЮ ТРЭБА СПЫНІЦЬ

На пытанні чытачоў адказала дацэнт кафедры алергалогіі і прафпаталогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Людміла МАСЛАВА.

(Працяг. Пачатак у нумарах за 4, 5 і 6 мая.)

☎ ***— Мінск, Вера. Я заўзяты аматар лазні. Але апошнім часам заўважыла, што калі карыстаюся мылам, скура рэагуе дрэнна. Мне падказалі, што лепш выкарыстоўваць гель. Ці так гэта? І ўвогуле, як можна ўмацаваць скуру?***

— У кожнага чалавека індывідуальная адчувальнасць скуры. Калі вы бачыце, што пасля мыла ў вас з'яўляюцца непрыемныя адчуванні, то не карыстайцеся гэтым мылам. Падбярыце сабе іншы мыйны сродак, такі, які вам падыдзе. Для ўмацавання скуры вельмі карысныя загартавальныя працэдуры: тая ж лазня, саўна. Важнае значэнне мае паўнавартаснае харчаванне і, зразумела, здаровы лад жыцця ў цэлым. Калі сітуацыя будзе моцна вас непакоіць, варта звярнуцца да дэрматолага.

☎ ***— Лагойск, Ганна Уладзіміраўна. У маіх 6-гадовых дзяцей-блізнят — паліноз. Ён праяўляецца кан'юнктывітам, рынітам, кашлем. Як нам лячыцца?***

— Па-першае, вам трэба звярнуцца да ўрача, каб ён паслухаў лёгкія і высветліў прычыну кашлю. А па-другое, паколькі ў вашых дзяцей алергічнае захворванне, то трэба прымаць антыгістамінныя прэпараты.

— Мы прымаем ларатадзін.

— Добра.

— А прывыканне да яго не будзе развівацца?

— Не. Гэты прэпарат можна прымаць на працягу таго часу, калі праяўляюцца сімптомы хваробы. А восенню трэба зрабіць пробы, каб высветліць, што канкрэтна выклікае захворванне. І калі ўжо вашым дзецям 6 гадоў, то ім можна праводзіць алергенспецыфічную імунатэрапію — лячыцца тым алергенам, які выклікае хваробу. Аднак канчатковае рашэнне павінен прыняць алерголаг.

— Яшчэ я чула, што ў нашым выпадку можа дапамагчы такі народны сродак, як яечная шкарлупіна з лімонам. Ці праўда гэта?

— Я б не рэкамендавала лячыцца такім чынам. Увогуле ніякімі травамі, мёдам, іншымі «народнымі сродкамі» карыстацца не варта. Нават той жа лімон можа выклікаць абвастрэнне хваробы.

☎ ***— Хоцімск, Наталля Міхайлаўна. Ужо 10 гадоў цярплю ад алергіі. Дыягназ — паліноз. У перыяд абвастрэння хваробы прымаю эрыус, альдэцын. Але гэтыя прэпараты здымаюць толькі сімптомы. А чым увогуле можна вылечыць хваробу? І дзе ў Беларусі можна прайсці поўнае абследаванне з прычыны алергіі?***

— Эрыус можна прымаць, а вось альдэцын ужо стары прэпарат, лепш замяніць яго на назанекс. Аднак сапраўды гэтыя прэпараты здымаюць толькі сімптомы. Таму восенню вам трэба зрабіць скурныя пробы, каб высветліць «вінаватага» хваробы. Па выніках вам прызначаць лячэнне. Самае эфектыўнае — гэта алергенспецыфічная імунатэрапія. Вы можаце прайсці абследаванне ў Гомельскай абласной бальніцы.

☎ ***— Астравец, Ала Кузьмінічна. У знаёмай — рэўматоідны артрыт. Да таго ж яе турбуе пастаянны сверб па ўсім целе. Яна прымала супрацьалергічныя прэпараты. Не дапамагаюць. Прасіла спытаць: як ёй лячыцца, дзе абследавацца?***

— Не падобна, што ў яе ёсць алергія, бо супрацьалергічныя прэпараты ў гэтым выпадку не дапамагаюць. Звярнуцца трэба да алерголага ў Гродзенскую абласную бальніцу. Але перад гэтым трэба абследаваць страўнікава-кішачны тракт, шчытападобную залозу.

☎ ***— Шчучын, Ларыса. Скажыце, калі ласка, як вы ставіцеся да біялагічна-актыўных дабавак? Ці могуць яны выклікаць алергію?***

— БАДы не лечаць. Ужо з самой назвы вынікае, што гэта ўсяго толькі дабаўкі. Калі прызначаць іх сабе самому, яны могуць выклікаць не толькі алергію, але і іншыя непажаданыя рэакцыі.

☎ ***— Гродна, Наталля. Чула, што астма ў дзіцяці можа знікнуць сама па сабе. Ці так гэта?***

— Дыягназ бранхіяльная астма — даволі сур'ёзны. Гэта хранічная хвароба, якая, на жаль, сама па сабе не пройдзе. Але калі правільна яе кантраляваць, то рэмісіі могуць быць вельмі працяглымі, і хвароба асабліва не будзе парушаць якасць жыцця. Для гэтага трэба, каб дзіця назіралася ва ўрача-алерголага, бо, як правіла, у дзяцей астма бывае алергічнай прыроды. Пры выяўленні прычынна-значнага алергена трэба максімальна пазбягаць кантактаў з ім.

☎ ***— Мінск, Марына. Ці можа алергія быць прычынай частых прастуд?***

— Алергія не з'яўляецца прычынай частых прастуд. А вось прастуда часта можа садзейнічаць абвастрэнню алергіі, асабліва, калі ў чалавека ёсць алергічная бранхіяльная астма.

☎ ***— Лепель, Марыя Іванаўна. Якія сімптомы сведчаць пра наяўнасць бытавой алергіі? І як з ёй змагацца?***

— Бытавая алергія ўзнікае пры кантакце з бытавымі алергенамі. Напрыклад, падчас работы з пыласосам, замене пасцельнай бялізны, навядзенні парадку ў шафе з адзеннем. Пры гэтай паталогіі з'яўляецца чханне, насмарк, кашаль. Прычым часцей сімптомы з'яўляюцца ў начны час. Асноўны метад барацьбы з бытавой алергіяй — максімальна выключыць кантакт з бытавымі алергенамі. Для гэтага трэба рабіць частае вільготнае прыбіранне, каб паменш было пылазборнікаў у кватэры. Аднак паколькі цалкам пазбегнуць кантакту з названымі алергенамі немагчыма, трэба лячыцца. Таму абавязкова звярніцеся да алерголага, каб правесці скурныя пробы з бытавымі алергенамі. І калі яны акажуцца станоўчымі, можна праводзіць алергенспецыфічную імунатэрапію. Лячэнне доўгае, на працягу 3-5 гадоў, але эфектыўнае.

☎ ***— Гомель, Ніна Пятроўна. У мяне алергія на пылок бярозы. Ці можна неяк падрыхтавацца да гэтага непрыемнага «часу слёз», каб зменшыць праявы хваробы?***

— Не толькі можна, але і трэба. Восенню вы павінны зрабіць скурныя пробы. Для гэтага звярніцеся да алерголага. Па выніках пробаў урач прызначыць вам алергенспецыфічную тэрапію пылком бярозы.

☎ ***— Горкі, Іна. Ці могуць дапамагчы сродкі народнай медыцыны пры палінозе?***

— Пры палінозе сродкі народнай медыцыны не могуць дапамагчы. Як правіла, яны нават пагаршаюць стан хворых. Паліноз лечыцца толькі ў алерголага. Самае эфектыўнае лячэнне — гэта лячэнне вінаватымі ва ўзнікненні хваробы алергенамі. Інакш кажучы, алергенспецыфічная імунатэрапія.

☎ ***— Талачын, Антаніна Іванаўна. Якую дапамогу да прыходу ўрача можна аказаць чалавеку, у якога пачаўся прыступ астмы?***

— У пацыентаў з астмай заўсёды пры сабе павінны быць прэпараты хуткай дапамогі. Гэта хуткадзейныя інгалятары, такія, як сальбутамол, бератэк. І абавязкова пры прыступе астмы трэба выклікаць «хуткую дапамогу». Увогуле, калі ёсць прыступы ўдушша — гэта значыць, што чалавек не лечыць сваю астму. А між іншым цяпер ёсць прэпараты, якія дазваляюць так кантраляваць хваробу, што прыступы бываюць вельмі рэдкімі або ўвогуле адступаюць.

☎ ***— Брэст, Сямён Пятровіч. Ці могуць прыступы астмы быць справакаваныя рэзкімі перападамі тэмператур?***

— Так можа быць. Але гэта сведчыць пра тое, што астма дрэнна лечыцца. Таму трэба, каб доктар прызначыў вам базісную тэрапію, інгаляцыйныя кортыкастэроідныя прэпараты. Пры такім лячэнні пацыент увогуле можа не рэагаваць на высокую або нізкую тэмпературу.

☎ ***— Мінск, Эдуард Іванавіч. 76 гадоў. У мяне на вуліцы закладвае нос, цякуць слёзы. Антыгістамінныя сродкі фактычна не дапамагаюць, а ў апошні час іх прыём выклікае павышэнне крывянога ціску. Што можна мне параіць?***

— Антыгістамінныя сродкі не могуць павышаць артэрыяльны ціск. Калі вас рэгулярна турбуе закладзенасць носа, можна выкарыстаць супрацьзапаленчыя, супрацьалергічныя спрэі тыпу назанексу. Але перад выкарыстаннем такога спрэю абавязкова пракансультуйцеся з урачом-алерголагам.

☎ ***— Ашмяны, Вольга. Сыну 11 гадоў.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

ПЯЦЬ ХВІЛІН НА РОЗДУМ
В. Кліпачоў



Белыя: Крh5, Фd4, Се1, Кb2, Кe3 (5).
Чорныя: Крe2, пп. d5, f2 (3).
Мат за 2 хады.
І. Суворaў



Белыя: Крd7, Лb2, Са6, Ка7, п. с3 (5).
Чорныя: Крb6, п. b5 (2).
Мат за 3 хады.
Чакаем вашых адказаў.

ПАСВЯЧЭННЕ Ў «БЛІЗНЯТЫ»

Задачы або эцюды, якія маюць адну характэрную прыкмету, але розныя рашэнні, называюцца блізнятамі. Атрымаць такую пазіцыю можна шляхам перастаноўкі фігуры, пешкі, караля на другое поле; заменай адной фігуры другой; зняццем, прыбаўленнем фігуры, перастаноўкай пазіцыі ўніз, уверх, улева, управа; паваротам шахматнай дошкі па гадзіннікавай стрэлцы або супраць яе без змянення задання; шляхам змянення ўмовы задачы і г.д.

Прыклады. **А. ВАСІЛЕНКА** (Кіеў) «VI матч гарадоў-герояў» 2010 г. **Белыя:** Крс8, Лс2, Ле5, Ch8, Kd2, Ke3, п. f5 (7). **Чорныя:** Крa1, Лс6, Cb1, Ka4, Kg3, пп. a2, a3, b6, c4, c7 (10). Мат за 2 хады. Блізня. Крa1→d6. Рашэнне а) 1. Ke:c4! б)1. Kb3!

С. РУМЯНЦАЎ. «Омская правда» 1970 г. **Белыя:** Крс8, Фс3, Лf3, Cf8, пп. c7, e7 (6). **Чорныя:** Крd1(1). Мат за 2 хады. 1. e8C. Блізня: белая пешка c7 на c6. 1. e8K!

Яшчэ адзін «блізнюк» з'яўляецца, калі павярнуць дошку па гадзіннікавай стрэлцы на 90 градусаў. Рашэнне — 1. Cg2! Бываюць яшчэ кампазіцыі, у якіх пасля ўступнага ходу белых узнікае новая задача з той жа ўмовай (прадоўжаная задача); двух- і шматфазныя «блізняты», якія адрозніваюцца адзін ад аднаго як сапраўднай гульнёй, так і ілюзорнай.

Прыклады. **М. ЛОКЕР. Белыя:** Крb3, Фg6, Ka4 (3). **Чорныя:** Крb5, Ka8, пп. a5, d5 (4). Мат за 2 хады. 1. Фe6! — цугцванг. Пасля першага ходу ўзнікае новая задача. Рашаецца так. 1. Фc8!

Ф. САЛАЗАР. Белыя: Крf2, Фg3, Лb4, Cb6, Ke3, Kh5, пп. c2, h4 (8). **Чорныя:** Крe4, Фa8, Ла4, Лc4, Cd7, Ch8, Kd8, пп. e6, g4, g5 (10). Мат за 2 хады. в) Cd7→f1 а) 1... e5 2. Фg2x. 1. Фc7!~2. Фg3x, 1... e5 2. Фc4x, але 1... Ce5! Рашае 1. Фd6! ~2. Kg3x, 1... e5 2. Фd3x. в) 1... e5 2. Фg4x. 1. Фd6? e5 2. Фg6x. 1... Ce5!

Рашае. 1. Фc7!~2. Kg3x, 1... e5 2. Фh7x.

ВЫШЫЎКА ДЛЯ ДУШЫ

Прэм'ера рубрыкі: «Жыццялюбы»

Ёсць дастаткова шмат прыкладаў, калі жанчыны, якія выходзяць на пенсію, толькі тым і займаюцца, што нудзяцца ды сядзяць на лавачках і перамываюць мінакам костачкі. А мужчыны, якія атрымліваюць групу інваліднасці, страчваюць прагу да жыцця і, што самае страшнае, топяць сваё гора на дне бутэлькі... Але, дзякуй Богу, ёсць і іншыя, тыя, хто перакананы: з выхадам на пенсію (на групу) жыццё не заканчваецца! Да такіх вось жыццялюбаў з Барысава карэспандэнт «Звязды» і завітала ў госці.

«Хочацца мне рабіць нешта прыгожае сваімі рукамі. На жаль, маляваць фарбамі не ўмею, таму раблю гэта пры дапамозе іголкі з ніткай».

«Ну, Няжданава, моцна ты падсела на гэту іголку»

— «Сара Мун», «Бетховен», «Хлопчык з лютняй», «Пацалунак Густава Клімта», «Егіпецкія і пецярбургскія замалёўкі», «Мэрылін Манро», «Марлен Дзітрых», «Прынцэса Дзіяна», «Дзяўчына з жамчужнай завушніцай», яшчэ адна «Мэрылін Манро»... — расстаўляе па ўсім пакоі свае вышытыя крыжыкам карціны Таццяна Няжданава.

— Таццяна Пятроўна, сярод вашых карцін добрая палова — знакамітыя жаночыя вобразы. Чым гэта абумоўлена? — спрабую завязаць размову.

— Манро, Дзітрых — згадзіцеся, прыгожыя дзяўчаткі. Чаму б іх не вышыць?! Люблю ўсё прыгожае, у тым ліку жывапіс. Калі еду за мяжу, абавязкова наведваю мастацкія музеі. Напрыклад, у Іспаніі завітала ў музей Сальвадора Далі. Як толькі вярнулася дадому, адразу ж села вышываць яго «Галатэю сфер»... Хочацца мне рабіць нешта прыгожае сваімі рукамі. На жаль, маляваць фарбамі не ўмею, таму раблю гэта пры дапамозе іголкі з ніткай. Знаёмыя жартам кажуць: «Ну, Няжданава, моцна ты падсела на гэту іголку» *(смяецца)*.

— І хто ж вас падсадзіў на яе?

— Не паверыце, муж. Дзевяць гадоў таму прынёс стос часопісаў з бібліятэкі, у адным з іх я і натыкнулася на схему вышыўкі невялікага букеціка. Быў у мяне на той момант вольны час, вось і вырашыла паспрабаваць. І так захапілася, што дагэтуль не магу спыніцца.

— А праўда, што менавіта па вашай ініцыятыве ў Барысаве з'явілася свая аматарская студыя вышыўкі «Чароўны крыжык»?

— Усё пачалося з выставы прац, выкананых сваімі рукамі, якую я арганізавала на заводзе медыцынскіх прэпаратаў, дзе працавала да пенсіі. Работнікі завода падтрымалі маю ініцыятыву: прыносілі з дому не толькі вышыўкі, але і макрамэ, вырабы з бісеру, мастацкія фотаздымкі, малюнкі сваіх дзяцей... Столькі станоўчых водгукаў тады было! Пасля мне прапанавалі выставіць свае працы на Днях беларускага пісьменства, якія праходзілі ў Барысаве. Тады да мяне падышла заснавальніца мінскага клуба «Вышывальшчыца» і прапанавала: «Таццяна, чаму б табе ў горадзе не стварыць студыю вышыўкі?». А сапраўды, чаму б і не? Я на пенсіі, часу хапае, — пранеслася думка ў маёй галаве. Сказана — зроблена. Назаўтра я пайшла ў Барысаўскі Дом культуры. На шчасце, там маю ініцыятыву падтрымалі і адразу ж выдзелілі памяшканне, дзе мы, аматары вышыўкі, збіраемся штомесяц, каб абмяняцца схемамі, вопытам, інфармацыяй.

— І хто яны — барысаўскія вышывальшчыкі?

«20 гадоў працую, але ніколі не бачыла, каб мужчына ехаў і вышываў крыжыкам»

Так сталася, што ў 33 гады Алег Афонін атрымаў групу інваліднасці і вымушаны быў звольніцца з барысаўскага завода «Аўтагідраўзмацняльнік», дзе працаваў наладчыкам абсталявання.

— Я сам па сабе чалавек актыўны, не люблю сядзець без працы, — кажа Алег Мікалаевіч. — Вось і пачаў шукаць, чым бы запоўніць пустэчу. Спачатку хацеў заняцца пляценнем з лазы, але ў двухпакаёвай кватэры асабліва не развернешся. Вось я і выбраў варыянт, каб і для сям'і было зручна, і душы прыемна. Браў у бібліятэцы падручнікі і па іх вучыўся вязаць. У нас з Валянцінай на той час ужо было два сыны, аднаму пяць, а другому тры гадкі. Вось і вязаў ім кофтачкі, шалікі, касцюмчыкі, пальчаткі... А аднойчы ўбачыў у знаёмых вышытыя крыжыкам карціны і таксама вырашыў паспрабаваць. Пачаў адразу з кветачак ды матылькоў, а пасля падвярнуліся больш цікавыя схемкі. Вось ужо практычна 8 гадоў вышываю. Людзям мае працы падабаюцца, а гэта, паверце, вялікі стымул для працы.

— Бачу, у вас так шмат грамат і дыпломаў. А дзе вы выстаўляеце свае працы?

— Запрашаюць мяне на фестывалі нацыянальных культур у Гродне, двойчы прадстаўляў Мінскую вобласць на Славянскім базары ў Віцебску, выстаўляўся ў Нацыянальным мастацкім музеі ў Мінску... Мне вельмі падабаецца сустракацца з цікавымі людзьмі.

— А ў вас ёсць любімыя працы?

— Кожная любімая па-свойму, бо ў кожную ўкладваеш часцінку сябе. А вось самыя складаныя па выкананні карціны — «Баль», «Тайная вячэра». «Баль», напрыклад, вышываў больш за 4 месяцы, там больш за 80 тысяч крыжыкаў. Вышываў штовечар. Бывала, жонка прачнецца ў тры гадзіны ночы, а я на кухні за любімым заняткам. Пакрычыць на мяне і прагоніць спаць. Але нягледзячы ні на што, Валянціна маё захапленне вітае.

— Гэта праўда? — цікаўлюся ў спадарыні Афонінай.

— Праўда *(усміхаецца)*. Ведаеце, нам жа ніколі не трэба ламаць галаву, што падарыць сябрам і знаёмым на дзень нараджэння. Здымаеш са сцяны карціну і дорыш. Дзясяткі два ўжо раздарылі.

— Адну сваю працу я падарыў старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Леаніду Козіку, — дадае Алег. — Ён жа ў сваю чаргу праз нейкі час прыслаў мне ў адказ вышываную карціну, якую ён прывёз з Кітая.

— Алег ў мяне рознабаковы чалавек, — расказвае пра мужа Валянціна. — У яго цэлы тузін захапленняў. Вялікім попытам карыстаюцца яго карціны з саломкі на біблейскую тэму. Шмат прадалі знаёмым і родным з Масквы. Шмат раздарылі. Выдатна аздабляе рознакаляровай паперай вазоны для кветак. Вось бачыце, якія арыгінальныя *(паказвае)*, такіх ні ў кога не ўбачыце. Рыбалкай займаецца, у грыбы, хоць і не есць іх сам, любіць хадзіць, у ягады.

— Алег, а ці ёсць праблемы ў Барысаве з матэрыяламі для вышыўкі?

— Гэта раней праблемы былі. Цяпер усё даступна. Ёсць спецыялізаваныя крамы, аддзелы, якія прадаюць канву, ніткі і іншыя матэрыялы.

— Адзінае, што рамкі ў Барысаве ў два-тры разы даражэйшыя, чым у Мінску, — дадае Валянціна. — Менавіта таму Алег па іх у апошні час пачаў ездзіць у Мінск. Там на рынку за адзін раз пакідае па 100, а то і больш тысяч. Я, бывае, як жанчына, раззлуюся і выпалю: «Каб мне ніякіх грошай больш з сямейнага бюджэту на вышыўку не браў» *(смяецца)*. Дык што ж вы думаеце, кінуў вышываць? Не, знайшоў спонсара: яму маці на захапленне з пенсіі выдзяляе па 70 тысяч штомесяц. Яна сама швачка, і нават у свае 79 гадоў працягвае шыць. А ў 60 гадоў у яе адкрыўся талент — пачала пісаць вершы на біблейскую тэму. Вершы доўгія, складныя і глыбокія. А ў яе ж адукацыя 3 класы...

На развітанне я пацікавілася ў Алега, ці не саромеецца ён расказваць іншым пра сваё захапленне?

— Не саромеюся, хутчэй, наадварот *(усміхаецца)*. Аднойчы давялося ехаць на электрычцы ўсю ноч. Я дастаў канву і пачаў вышываць. Раптам чую гучны голас кантралёра: «Света, ідзі паглядзі, 20 гадоў працую, але ніколі не бачыла, каб мужчына ехаў і вышываў крыжыкам...

«Вой, дзе мне з імі, з дамамі, справіцца»

У той дзень мне пашчасціла пазнаёміцца яшчэ з адным барысаўчанінам, які без вышыўкі ўжо не ўяўляе свайго жыцця. Віктара Пашкевіча «на іголку падсадзіў» унук Саша, які цяпер вучыцца ў чацвёртым класе.

— Ад Сашы, якога вышываць крыжыкам навучылі на ўроках працы, спачатку «заразілася» дачка, яна цяпер у дэкрэтным водпуску, пасля — жонка, — расказвае гаспадар дома. — Я спачатку для сваёй Яфім'і Іванаўны, якая адразу ж пасля працы забывалася на ўсё і бралася за вышыўку, змайстраваў спецыяльнае крэсла з падстаўкай для схемы. А пасля думаю: дай і я паспрабую (тэлевізар надакучыў, кнігі ўсе, якія былі дома, перачытаў). Паспрабаваў на сваю галаву *(усміхаецца)*. А калі сур'ёзна, то вельмі рады, што знайшоўся гэты занятак.

— ?

— Чаму? Калі сядзіш без працы, думкі дрэнныя ў галаву лезуць. Я ж ваенны ў мінулым, 30 гадоў прысвяціў арміі... А зараз — зірніце на паліцу *(завалена рознымі таблеткамі)*... Не ад добрага жыцця вышываць пачаў. Проста сілаў ні на што іншае не засталося... Але апускаць рукі я не збіраюся!

— Яфім'я Іванаўна аддае перавагу кветкам ды персанажам з мультфільмаў. А вы, бачу, у асноўным вышываеце пейзажы і абразы...

— Што ты бачыш вакол? *(падводзіць мяне да акна)*. Шэрая брудная агароджа, шыфер, жалеза ржавае — куды ні кінь вокам, вакол шэрасць. Мне ж хочацца чагосьці яркага. Вось і вышываю прыроду. А абразы... Проста падабаюцца і ўсё. Ведаеш, я яшчэ ў школе па добраму зайздросціў аднакласніку Колю. Мы з ім за адной партай сядзелі. Ён хадзіў у мастацкую школу, і яго карціны можна было бачыць на вітрынах мастацкай крамы. Зараз жа я таксама малюю, хоць і па схеме, і маімі карцінамі таксама любуюцца людзі на выставах, якія арганізоўвае спадарыня Няжданава. Ведаеце, калі я любую мужчынскую працу да пары да часу элементарна мог рабіць, то стварыць прыгожую карціну — гэта было для мяне нечым недасягальным.

— А хто хутчэй вышывае?

— Вой, дзе мне з дамамі справіцца *(усміхаецца)*.

Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.

«Бывала, жонка прачнецца ў тры гадзіны ночы, а я на кухні займаюся любімым заняткам. Пакрычыць на мяне і прагоніць спаць. Але нягледзячы ні на што, Валянціна маё захапленне вітае».

Ад аўтара. Калі вярталася дадому пасля сустрэчы з барысаўскімі жыццялюбамі, не паверыце, не адчувала стомы, а проста па інерцыі ўсміхалася ўсім мінакам. Бо ўсмешка і аптымізм (як даказвае жыццё) рэч заразная.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.22	20.52	15.30
Віцебск —	5.06	20.47	15.41
Магілёў —	5.12	20.42	15.30
Гомель —	5.14	20.32	15.18
Гродна —	5.38	21.06	15.28
Брэст —	5.44	21.00	15.16

Месяц
Апошняя квадра 6 мая. Месяц у сузор'і Рыбаў.

Імяніны
Пр. *Елізаветы, Аляксандра, Аўсея, Аляксея, Валянціна, Савы, Фамы.*
К. *Даніцэлі, Людмілы, Ружы, Бенядыкта, Вінцэнта.*

Фота Сафі КУСЯНКОВАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА	+20..+22°С	КІЕЎ	+23..+24°С	РЫГА	+18..+28°С
ВІЛЬНЮС	+17..+19°С	МАСКВА	+26..+28°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+7..+9°С

Дзве даты

7 мая

1794 год — Тадэвуш Касцюшка выдаў Паланецкі ўніверсал, згодна з якім усе сяляне Рэчы Паспалітай, у тым ліку і беларусы, абвяшчаліся свабоднымі ад прыгоннай залежнасці.



1895 год — рускі вучоны Аляксандр Папоў прадэманстраваў прынцып дзеяння вынайдзенага ім першага ў свеце радыёпрыёмніка.

Цытата дня:

«Самае складаное ў спрэчцы — не толькі абараняць свой пункт гледжання, колькі мець аб ім дакладнае ўяўленне».

Андрэ Маруа (1885—1967), французскі пісьменнік.

ЯЧМЕНЬ, ПШАНІЦА, ЖЫТА

На Пахомія (28 мая) сеялі позні авёс, пшаніцу і ячмень. Ячмень — адна са старажытных раслін у нашым земляробстве. Як і любая збожжавая культура, ва ўсходніх славян ячмень сімвалізаваў пладаноснасць, адраджэнне жыцця і яго аднаўленне. Ячмень выкарыстоўвалі для прыгатавання круп, мукі, а таксама корму для жывёлы. Лічыцца, што адным з першых п'янлівых напояў, які навучыліся рабіць людзі, была ячменная брага. Ячмень імкнуліся сеяць, калі цвіце каліна. У народзе прыкмячалі: «дрэнна той ячмень народзіцца, які пасеяны пры заходнім і паўднёва-заходнім ветры».

- Феадор-жытнік — так звалі ў народзе святога Фёдара (29 мая). Гэты дзень лічыўся апошнім тэрмінам для пасеву яравых: «На Фёдара Жытніка неабходна сеяць жыта»; «У Жытніка клопаты — ячменныя палеткі забараноўваць».
- **Жыта** — збожжавая расліна, з зерня якой пякуць чорны хлеб. Жытні хлеб — штодзённая ежа нашых продкаў. Славяне здавён звалі жытні хлеб — «хлебушка», а зерне і палеткі — «жыта».
- У культуры ўсходніх славян зерне жыта сімвалізавала бессмяротнасць. Ураджай жыта даваў надзею на шчаслівае, багатае жыццё. Няўрод часам заканчваўся трагічна — галоднай смерцю. Нездарма з палеткамі, засеянымі збожжавымі культурамі, чалавек размаўляў, як з лепшым сябрам.
- Да пасеваў жыта заўсёды ставіліся вельмі адказна, выбіралі самы спрыяльны для гэтага дзень. Прыкмячалі: калі пры пасеве жыта ідзе маленькі дождж, то гэта «Бог аб ураджаі вестку дасылае», а калі дождж быў моцны — лепш з поля з'ехаць, усё адно ўраджаю не будзе. У насенне жыта дадавалі попел з печы, каб засцерагчы палеткі ад граду.
- У творчасці ўсходніх славян жыта — гэта ўдава, а **пшаніца** — дзеўка ці маладая жонка — малодка. Цяжкасці пры вырошчванні гэтай культуры стварылі вакол яе арэол святасці. Пшанічны хлеб пяклі ў святы і для некаторых іншых асобных святочных падзей, напрыклад, на вяселле (каравай). Для таго, каб быць з ураджаем пшаніцы, раілі сеяць гэту культуру ў час, калі красуе чаромха. Таксама раілі пачынаць сеў пшаніцы абавязкова апоўдні: «закрасуе ніва пшанічным руном, калі пасееш у зацішны поўдзень».
- Каб прадказаць, ці ўдалым будзе год для пшаніцы, у Чысты чацвер з храма неслі запаленыя свечкі: калі свечкі не гаслі па дарозе дамоў — ураджай будзе добрым.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Тэлесеткі

Беларускі парад Перамогі ўбачаць у Расіі і ва Украіне

А праз спадарожнік — і яшчэ ў больш як 50 краінах свету

Прамую трансляцыю святочнага парада і шэсця, што праходзіць 9 мая ў сталіцы, традыцыйна паказвае ў Беларусі Першы канал. Аднак сёлета гэта ўрачыстае мерапрыемства змогуць убачыць і гледачы іншых краін. «У сувязі са значнасцю даты і зацікаўленасцю нашых партнёраў па еўрапейскім вяшчальным саюзе Белтэлерадыёкампанія будзе весці спадарожнікавую трансляцыю ваеннага парада, прысвечанага 65-й гадавіне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне», — паведамілі ў прэс-службе БТРК.

Па дамоўленасці беларускага боку з Нацыянальнай тэлекампаніяй Украіны скарочаную версію парада і шэсця, што адбудуцца ў Дзень Перамогі ў Мінску, пакажа ўкраінскі Першы нацыянальны канал. Запланавана таксама прамое ўключэнне з расповедам пра святочныя мерапрыемствы ў Беларусі ў выпуску навінаў расійскага тэлеканала ГРТ. А з дапамогай спадарожнікавых каналаў трансляцыю парада ў Мінску змогуць прымаць 75 тэлекампаній з краін Еўропы, Блізкага Усходу і Паўночнай Амерыкі!

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Невядомае пра вядомае: таямніцы музея Вялікай Айчыннай

Да 65-годдзя Перамогі Першы канал рыхтуе двухсерыйны дакументальна-пастановачны фільм «ЗАХОЎВАЦЬ ВЕЧНА», які распавядае пра Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Менавіта музей і гісторыя яго стварэння, а не ягоныя экспазіцыі, пра якія экскурсаводы паспелі ўжо расказаць мільёнам наведнікаў, зацікавілі карэспандэнтаў Агенцтва тэленавінаў. Бо гэтая гісторыя сапраўды вартая таго, каб яе ўзгадаць. Напрыклад, ці многія з нас ведаюць, што музей быў створаны яшчэ падчас вайны, і першыя яго экспанаты супрацоўнікі збіралі літаральна пад кулямі, а першы будынак абаранялі са зброяй у руках?.. Затое праз некалькі гадоў ён стаў візітоўкай БССР, гонарам Панамарэнкі і Машэрава, месцам, якое штогод выклікала цікавасць у больш як паўмільёна чалавек са 140 краін свету.

Пра што яшчэ раскажа фільм? Аўтар праекта Аляксандр Гарадко пералічвае наўскідку: пра музейнае супрацьстаянне СССР і трэцяга рэйха, пра візіты сюды Фідэля Кастра і Ясіра Арафата, пра ўнікальны ордэн коштам у сотні тысяч еўра, што захоўваецца ў «скляпеннях» цяперашняга будынка, а таксама пра крадзяжы, якія ўдалося прадухіліць, і, натуральна, як пра дзень сённяшні, так і пра тое, што чакае музей заўтра.

Прэм'ера дакументальна-пастановачнага фільма «ЗАХОЎВАЦЬ ВЕЧНА» адбудзецца на Першым канале 8 і 9 мая ў 14.30.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Усміхнемся!

Калі вы, перад тым як урэзацца ў дрэва на поўнай хуткасці, пачынаеце ўспамінаць, дзе тормаз, напрыканцы паглядзіцеся ў люстэрка — хутчэй за ўсё, ён там!

☺

Старшыня калгаса на сходзе:

— Я ў апошні раз пытаюся, хто ў нас корміць свіней гербалайфам?

☺

Дачка — бацьку:

— Расказаць, як прайшоў мой першы дзень за рулём, ці сам з газет даведаешся?..

☺

Мужчына ўладкоўваецца на працу ў сімфанічны аркестр. Яго паслухалі — валоданне інструментам цудоўнае, слых абсалютны, іграе эфектна, увогуле — мара любога аркестра.

— Выдатна, будзем вас афармляць. Як ваша прозвішча?

— Сцяпанаў.

— Сцяпанаў? Хм... Дзіўна... А імя?

— Іван.

— Іван?! Дзіўна... А імя па бацьку?

— Апалінар'евіч.

— Ах, як глыбока бывае закапаны талент!

Віншуем **з днём нараджэння Юрыя БАБІЧА**, які жыве і працуе ў г. Віцебску. Жадаем моцнага здароўя, дабрабыту, поспехаў у працы, доўгіх гадоў жыцця.

Родныя *з Глыбокага.*

«У студзені ў Рэчы Паспалітай ужо цвітуць фіялкі...»

Амбасада Польшчы перадала ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі 26 тамоў унікальных допісаў Папскіх нунцыяў XVI—XVIII стагоддзяў з Рэчы Паспалітай у Ватыкан

НУНЦЫІ — дыпламаты, пасланнікі Папы, якія мусілі наўпрост штотыдзень падрабязна апісваць ватыканскаму кіраўніцтву сітуацыю ў рэгіёне. Што цікава, пісалася не толькі пра справы ў касцёле і дзяржаве, але і пра звычаі мясцовых жыхароў, традыцыі і святы, побыт і нават надвор'е. Польскія навукоўцы займаюцца расчытваннем дакументаў ужо не першы дзясятак гадоў, беларускім калегам прэзентавана ажно 26 тамоў дакументаў. Для нас яны каштоўныя тым, што часам у поле зроку нунцыяў патраплялі і беларускія землі — калі нунцый з Рэчы Паспалітай выпраўляўся ў вандроўку па Вялікім Княстве Літоўскім. Гэтыя дакументы даюць нам неверагодна цікавыя дэталі з жыцця краіны XVI—XVIII стагоддзяў. Адметна, што такога збору, які падаравалі нам, няма пакуль ні ў адной бібліятэцы на ўсім абшары былога Савецкага Саюза.

Ва ўрачыстасці ўзяла ўдзел адна з аўтарак праекта, прафесар Тэрэса ХЫНЧЭЎСКА-ГЕНЭЛЬ, гісторык, сябра Польскай акадэміі навук. Пасля афіцыйнай часткі пані Тэрэса ласкава адказала на некалькі пытанняў карэспандэнта «Звязды».

— Пані прафесар, як вы мяркуеце, чаму ў гэтых дакументах нунцыі апісвалі не толькі касцёльныя і дзяржаўныя справы, але і штодзённае жыццё тутэйшага люду?

— Разумееце, Апостальская сталіца была зацікаўленая вывучэннем гэтага краю, у які высылала свайго нунцыя (амбасадара). Хацела зразумець, на чым грунтавалася шляхецкая дэмакратыя, як гэты край функцыянаваў. Без разумення гэтай дзяржавы няма мэты высылаць свайго дыпламата. Таму ў інструкцыях для нунцыя напісана, што ён мусіць вельмі ўважліва падыходзіць да фактаў, бо тут жылі не толькі католікі, але і праваслаўныя, лютэране, пратэстанты... Трэба было звяртаць увагу на тое, што Рэч Паспалітая карысталася ваеннай сілай казакоў, якія былі праваслаўнымі. Цікава, што гэтае праваслаўе казакоў бачылі папскія нунцыі, але вельмі часта не бачыла польская шляхта...

— Вы згадалі, што быў выпадак, калі аднаго нунцыя выслалі і абвясцілі персонай нон-грата. А ўвогуле, нунцыяў не лічылі шпіёнамі?

— Агулам да ўсіх так не ставіліся. Перад нунцыем Марыё Філянардзі, якога змусілі пакінуць Рэч Паспалітую, быў нунцый Віконці, які здабыў вялікую сімпатыю каралеўскага двара, шляхты. Ажно настолькі, што кароль Уладзіслаў IV прасіў пра кардынальскі капялюш для яго — бо ўлады маглі выказваць сваю пазіцыю. Калі ён выязджаў, развітанне было вельмі цёплым. На жаль, яго наступнік усё сапсаваў, пачаў прасоўваць нейкія свае праекты, не заўважы думаючы пра Рэч Паспалітую. Ён уступіў у канфлікт з мітрапалітам Пётрам Магілам, крытыкаваў выбары... Супраць яго ашчаніліся абсалютна ўсе — і вымусілі яго пакінуць краіну.

— Пані Тэрэса, мы ведаем, што нунцыі знаходзіліся ў асноўным на тэрыторыі Рэчы Паспалітай, аднак часам вандравалі і на землі Вялікага Княства. Ці сустрэлі вы ў дакументах згадкі пра беларускія населеныя пункты?

— Так! Гэтыя дакументы — унікальная крыніца для ўсяе Рэчы Паспалітай, усіх земляў, якія пасля Люблінскай уніі апынуліся ў адной дзяржаве. Ужо згадвалася, што нунцыі часам здзяйснялі падарожжы ў Вялікае Княства таксама, і апісвалі гэтыя землі ў сваіх допісах. Цяпер не памятаю дэталяў, але сустракала рэляцыі з сённяшніх беларускіх земляў. Трэба проста гэта знайсці і апрацаваць.

— А з іншых цікавых падрабязнасцяў што можаце згадаць цяпер?

— Мяне проста ўразілі апісанні прыроды ў гэтых дакументах, ажно да біялагічных дэталяў: расліны, жывёлы, раскопкі касцей даўніх жывёлаў... Напрыклад, адзін нунцый апісаў, як у зямлі тагачасныя археолагі знайшлі маманта!.. Цікавае таксама апісанне Брэсцкай уніі, двух антыўнійных сінодаў... Часам апісанні дакументальныя, часам — у рэляцыях — нунцый дазваляў сабе мастацкія падрабязнасці. Гэта былі сапраўдныя рэпартажы!..

— Гэтыя дакументы накіроўваліся ў Ватыкан. Але, я так разумею, Папа не чытаў усё асабіста?..

— Вядома, не. Папа проста чытаў найважнейшае. А можа і не чытаў — хутчэй за ўсё, яму пераказвалі. Гэтая карэспандэнцыя паступала сакратару, які адказваў нунцыю, а для Папы складаў дайджэст — самае цікавае. Такім чынам, Папа знаёміўся з найважнейшымі навінамі, бо мусіў быць у курсе — таму што асабіста дэлегаваў нунцыя і мог яго адклікаць.

— Вы згадалі, што нунцыі пісалі нават пра надвор'е. Моцна адрознівалася яно 300 гадоў таму ад цяперашняга?

— Я зразумела адно: цяперашнія размовы пра глабальнае пацяпленне — дарэмная трывога. Я знайшла допіс аднаго нунцыя сярэдзіны XVII стагоддзя пра тое, што ў студзені тут пачалі цвісці фіялкі. Альбо нунцый піша: «Прыехаў воз, і людзі на возе былі ўшчэнт змерзлі...». Альбо: «Цяпер людзі яшчэ ездзяць санямі па затоцы Гданьскай...». Вось і мяркуйце, наколькі падрабязныя, насычаныя дэталямі былі гэтыя допісы!.. Улічваючы, што апрацаваныя намі дакументы ахопліваюць некалькі стагоддзяў, можна зрабіць цэлы дослед!..

Глеб ЛАБАДЗЕНКА. Фота аўтара.

P.S. **Гутарка перакладзеная з польскай мовы.**



Тэрэса ХЫНЧЭЎСКА-ГЕННЭЛЬ (справа) падчас перадачы дакументаў у Нацыянальную бібліятэку Беларусі.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 2194. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12